Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 КАСТРЫЧНІКА 2016 г. СУБОТА № 190 (28300)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Выхаваць людзей і грамадзян

**Педагагічным работнікам Рэспублікі Беларусь**

***Дарагія сябры!***

**Прыміце сардэчныя віншаванні з прафесійным святам — Днём настаўніка.**

**Мы гаворым словы шчырай удзячнасці нашым настаўнікам, людзям, якія дзяліліся з намі вопытам і ведамі, дапамагалі раскрыць здольнасці і знайсці сваю дарогу ў жыцці.**

**Прафесія настаўніка прад'яўляе да чалавека высокія патрабаванні. Бо педагог заўсёды на вачах, ён з'яўляецца для вучняў аўтарытэтам і павінен служыць для іх прыкладам, а гэта патрабуе ад вас эрудыцыі, творчага падыходу і пастаяннага самаўдасканалення.**

**Перад сучаснай сістэмай адукацыі стаяць выключна важныя задачы — не толькі навучыць, але і выхаваць маладое пакаленне працавітым, культурным, здаровым і маральным. Прывіць яму любоў да роднай зямлі, павагу да духоўных каштоўнасцяў нашага народа, імкненне стаць сапраўднымі майстрамі сваёй справы.**

**Дзякуй за вашу працу, цярпенне і дабрыню, за актыўную жыццёвую пазіцыю і работу на карысць будучыні Беларусі.**

**Здароўя, шчасця і дабрабыту вам і вашым блізкім.**

**Са святам!**

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр:**

*«Мы сталі вялікую ўвагу ўдзяляць малому і сярэдняму бізнесу. Разлічваем, што да канца 2020 года тры чвэрці аб'ёму эканамічнага росту будуць забяспечаны за кошт гэтых прадпрыемстваў. Малое і сярэдняе прадпрымальніцтва — гэта якраз той кірунак, які павінен стаць драйверам эканамічнага росту на пяцігодку».*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 21° |
| Віцебск | + 17 |
| Гомель | + 22° |
| Гродна | + 19 |
| Магілёў | + 17 |
| Мінск | + 18 |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 1.10.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9268 | ▲ |
| Еўра | 2,1551 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0303 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0743 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

# У ШКОЛЕ АДНОЛЬКАВЫХ ДЗЁН НЕ БЫВАЕ

## Рэпарцёр атрымаў заданне правесці адзін дзень з дырэктарам гімназіі




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Ірына Валер'еўна сярод сваіх выхаванцаў.

**«Зараз адпраўлю да дырэктара!» У каго ў школьныя гады не замірала сэрца ад адной гэтай фразы, нават калі яна была адрасавана іншым? Дырэктар бачыўся ўвасабленнем Вярхоўнага суда ў адной асобна ўзятай міні-рэспубліцы. Ды што раней, нават цяпер, калі школьная пара даўно ў мінулым, падыходзячы да кабінета дырэктара, адчуваеш пэўнае трапятанне. Аднак мы набраліся смеласці і «папрацавалі» разам з дырэктарам сталічнай гімназіі, каб даведацца, наколькі ўяўленне аб гэтай пасадзе адпавядае рэальнасці, што адрознівае сучасных дзяцей ад папярэдніх пакаленняў і ці ганарова цяпер быць педагогам.**

### Крэда перфекцыяніста

Працоўны дзень **Ірыны Валер'еўны ДАНЯНКОВАЙ** пачынаецца а палове восьмай раніцы. Дырэктар гімназіі №37, якая знаходзіцца ў мікраёне Сухарава, стараецца прыходзіць у сваю «вотчыну» адной з першых. І адразу ж нельга губляць ні хвіліны: па дарозе — беглы агляд тэрыторыі, потым — абавязковы абыход будынка гімназіі. Ірына Валер'еўна прызнаецца з усмешкай, што любіць усё кантраляваць асабіста: і як кветкі прапалолі, і як справаздачы склалі, і як урокі правялі.

— Я, бывае, праходжу па калідорах гімназіі, спецыяльна калі ідуць заняткі, і прыслухоўваюся, дзе якая абстаноўка. Хачу бачыць рэальную, а не «паказальную» карціну.

Па-сапраўднаму працоўны дзень у дырэктара пачынаецца з прывітання вучняў. Разам з дзяжурным класам Ірына Валер'еўна ў холе сустракае дзяцей, на тварах якіх замест хмурнага соннага выразу адразу ж з'яўляюцца ветлівыя ўсмешкі: гімназісты ведаюць, як трымаць марку. Тут жа да дырэктара могуць звярнуцца і бацькі. Нефармальнасць абстаноўкі істотна аблягчае працэс камунікацыі, так што ўсе пытанні, якія ўзнікаюць, можна хутка вырашыць.

— На мой погляд, добрага кіраўніка адрознівае жаданне разабрацца ў праблеме. Не проста ад яе як мага хутчэй пазбавіцца, а менавіта дайсці да вытокаў, не важна, будзе гэта канфлікт паміж вучнямі, сутыкненне падлеткаў з настаўнікам ці асабістыя прэтэнзіі адміністрацыі. Напрыклад, учора прыйшлі да мяне бацькі з просьбай перавесці дзіця ў іншы клас. Гэта абсалютна не цяжка, але ж і праблему, якая выклікала такое жаданне, не вырашае. Пачалі высвятляць, сабралі ў маім кабінеце цэлае пасяджэнне: двух хлопцаў, якія пасварыліся, іх бацькоў, класных кіраўнікоў, сацыяльнага педагога. У выніку — былыя «ворагі» паціснулі адзін аднаму рукі. А калі б адразу, не разабраўшыся, перавялі вучня ў іншы клас, сваркі б працягнуліся. Так што да прынящця ўсіх рашэнняў трэба падыходзіць вельмі абдумана, у рабоце з дзецьмі дробязяў не бывае.

СТАР. 5

■ Вальсуюць усе!

# ПАД ПЕСНІ СВАЁЙ МАЛАДОСЦІ

## Як сталічныя пенсіянеры адпачываюць на дыскатэцы для пажылых

**У Палацы культуры ветэранаў гучыць музыка 60-х. За пультам — сівы дыджэй, на паркеце — пары элегантнага ўзросту. Жанчыны, якім пашанцавала, танцуюць з мужчынамі. Іншыя дамы не губляюцца: запрашаюць адна адну і зухавата кружаць пад песні сваёй маладосці. На журнальным століку ў фае — кішэнныя памяткі пра тое, як не заблытацца ў новых грашах, каля пустой канапы — чыясьці забытая палка. Як прайшоў восеньскі баль для пенсіянераў, прысвечаны Дню пажылых людзей, — у нашым рэпартажы.**

СТАР. 5



Фота Надзеі БУЖАН.

# АДЛЕГЛАСЦЬ ДРУЖБЕ НЕ ПЕРАШКОДА

**Трэці дзень дзяржаўнага візіту Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі ў Кітайскую Народную Рэспубліку быў насычаны. Прэзідэнт Беларусі правёў перагаворы з Прэм'ерам Дзяржаўнага савета КНР Лі Кэцянам і наведаў Пекінскі ўніверсітэт, дзе выступіў перад студэнтамі.**

Сёння адзначаецца Дзень абвяшчэння Кітайскай Народнай Рэспублікі. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Старшыню КНР Сі Цзіньпіна і дружалюбны народ гэтай краіны са святам.

Напярэдадні 25-й гадавіны ўстанаўлення дыпламатычных адносін Прэзідэнт Беларусі з задавальненнем адзначыў каласальны якасны прарыў у супрацоўніцтве паміж дзвюма краінамі, дасканалы за такі невялікі прамежак часу.

Аляксандр Лукашэнка перакананы, што далейшае збліжэнне Мінска і Пекіна — гэта правільны шлях.

Падчас сустрэчы з Лі Кэцянам кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што ўжо на працягу двух з паловай дзясяткаў гадоў цікавіцца вопытам развіцця Кітая. «Інтуітыўна яшчэ тады — да свайго прэзідэнцтва — я зразумеў, што будучае нашай планеты за Кітаем. Як бачыце, я не памыліўся», — адзначыў Прэзідэнт.

У сваю чаргу, Лі Кэцян выказаў упэўненасць, што дзяржвізіт Аляксандра Лукашэнкі надасць дадатковы магутны імпульс далейшаму развіццю кітайска-беларускіх адносін.

Выступаючы перад студэнтамі Пекінскага ўніверсітэта, беларускі лідар закрануў не толькі пытанні развіцця беларуска-кітайскіх адносін, але і падзяліўся сваім бачаннем сучаснай сітуацыі ў свеце.

«Я ўжо гаварыў, быўшы ў ААН, што глыбінная крыніца ўсіх крызісаў тоіцца ў штучным несуразмерным культываванні індывідуальных правоў і свабод чалавека на шкоду грамадскім інтарэсам, — сказаў Прэзідэнт. — Прыкрываючыся лозунгам абароны правоў чалавека, звяргаюцца ўрады, разбураюцца дзяржавы, арганізуюцца ваенныя інтэрвенцыі. Па сутнасці, насаджваюцца хаос і анархія са шматлікімі чалавечымі ахвярамі. Але ж нават шчырыя, добрыя мэты не павінны дапускаць нягодных сродкаў іх дасягнення».

Паводле слоў кіраўніка беларускай дзяржавы, міжнародная палітыка сёння характарызуецца моцнай канкурэнцыяй ва ўсіх сферах жыццядзейнасці, уключаючы эканамічную, навуковую і культурную. Абстаноўка ў свеце вельмі абвастрылася, з'явіліся новыя сур'ёзныя выклікі: узброеныя канфлікты ў Сірыі і Украіне, сітуацыя з мігрантамі. «Але ўсім вядома, што новыя выклікі — гэта і новыя шанцы. Сусветная супольнасць проста абавязана знайсці выхады і развязкі для іх дастойнага вырашэння. Галоўным прынцыпам павінны быць не канфрантацыя краін, не насілле, а ўзаемаразуменне, дружалюбнасць і супрацоўніцтва дзеля агульнай карысці чалавецтва», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Толькі шматпалярны свет можа ўтрымаць і выратаваць нашу планету ад разбурэнняў. Ні адна сістэма не можа доўга ўстаяць на адной апоры. Чым іх больш, тым магутней сістэма. І адной з апор гэтай шматпалярнасці і ўстойлівасці з'яўляецца КНР. І мы вельмі зацікаўлены, каб гэтая апора пастаянна ўмацоўвалася. У гэтым наш прагматызм, — заявіў Прэзідэнт. — Будзе магутны і моцны Кітай — будзе суверэнная і незалежная Беларусь. Таму што гэта наш сябар, на плячо якога мы заўсёды зможам абаперціся».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь цвёрда прытрымліваецца шматвектарнай знешняй палітыкі, развівае адносіны з усімі без выключэння рэгіёнамі свету, з усімі дзяржавамі. «Мы заўсёды зыходзім з такога разумення пры выпрацоўцы і ажыццяўленні сваёй знешняй палітыкі. Таму нацэлены выключна на ўмацаванне і пашырэнне супрацоўніцтва з усімі суседзямі — і на Усходзе, і на Захадзе — настолькі глыбока, наколькі гэта магчыма, але не на шкоду камунебудзь. Мы вядзём дыялог з тымі партнёрамі, якія гатовы будаваць адносіны з Беларуссю на раўнапраўнай аснове, без дыктату і прымушэння», — заявіў кіраўнік дзяржавы, дадаўшы, што Беларусь выступае за бясспрэчнае вяршэнства права ў міжнародных адносінах, на якім павінна грунтавацца сучаснае справядлівае і шматпалярнае светаўладкаванне.

«Гістарычна склалася, што праз нашы землі ў цэнтры Еўропы шмат стагоддзяў праходзіць так званая лінія сутыкнення інтарэсаў буйнейшых дзяржаў, якую шэраг даследчыкаў называюць лініяй сутыкнення цывілізацый. Не прэтэндуючы на глабальныя геапалітычныя амбіцыі, мы змаглі стварыць востраў стабільнасці ў нашым рэгіёне, сфарміраваўшы дружалюбныя і ў дастатковай ступені даверныя адносіны з усімі нашымі суседзямі: Расіяй, Еўрапейскім саюзам, Украінай», — заявіў беларускі лідар.

Паводле слоў Прэзідэнта, Беларусь — дзяржава, якая падпарадкавала сваю знешнюю палітыку прагматычным і зразумелым мэтам, галоўнымі з якіх, безумоўна, з'яўляюцца павышэнне дабрабыту і ўзроўню жыцця народа, а таксама забеспячэнне бяспекі ў краіне і добрасуседства на граніцах.

Беларусь падтрымлівае ідэю спалучэння інтэграцыі ў ЕАЭС з развіццём праекта Эканамічнага пояса Шаўковага шляху, заявіў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што наша краіна паслядоўна выступае за фарміраванне ўстойлівых механізмаў дыялогу і супрацоўніцтва паміж ЕАЭС і іншымі інтэграцыйнымі аб'яднаннямі. «Учора на перагаворах з Сі Цзіньпінам адзначана важнасць таго, каб рэалізацыя ідэі пояса Шаўковага шляху была звязана з інтэграцыяй у ЕАЭС. Мы з гэтым згодны», — заявіў Прэзідэнт, выказаўшы перакананасць у тым, што істотную карысць у рэалізацыі гандлёва-эканамічных і інвестыцыйных інтарэсаў магло б прынесці супрацоўніцтва ЕАЭС з ШАС, АСЕАН, Еўрасаюзам і іншымі рэгіянальнымі аб'яднаннямі.

Гаворачы пра Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень», Прэзідэнт назваў яго ўзорам інвестыцыйнага супрацоўніцтва. «Праводзячы перагаворы з прэм'ерам Дзяржсавета Кітая і з Сі Цзіньпінам, мы дамовіліся, што індустрыяльны парк «Вялікі камень» у Беларусі павінен стаць узорам яшчэ і для таго, каб прадэманстраваць усяму свету, і перш за ўсё высокатэхналагічнай Еўропе, што такое Кітай сёння, — сказаў беларускі лідар. — Нам трэба пабудаваць узорна-паказальны тэхналагічны комплекс, каб іншыя краіны Еўропы, убачыўшы гэта, пажадалі супрацоўнічаць з Кітаем. І чаго б нам ні каштавала, гэты праект будзе рэалізаваны».

Паводле слоў беларускага лідара, закладзены добры фундамент і для развіцця супрацоўніцтва моладзі і студэнтаў дзвюх краін: адкрыта каля двухсот адукацыйных праграм, у Беларусі створаны тры інстытуты і сем класаў Канфуцыя, у Другім Пекінскім універсітэце замежных моў адкрыты курсы беларускай мовы. Прэзідэнт заклікаў шукаць і выкарыстоўваць самыя разнастайныя формы для развіцця маладзёжных і студэнцкіх кантактаў. «Давайце разам вучыцца і працаваць. Гэта будзе добрым фундаментам для развіцця ў далейшым нашых адносін», — сказаў ён.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, стратэгія развіцця сучаснай Беларусі грунтуецца на сацыяльна арыентаванай рыначнай эканоміцы, у якой дзяржаве адведзена вельмі важная роля па мадэрнізацыі вытворчасці і стымуляванні росту прадукцыйнасці працы. «Але зразумела, што дасягненне гэтых мэт немагчыма без тэхнічнага прагрэсу, інвестыцый і ўзаемадзеяння са знешнім светам. І значнае месца ў гэтым працэсе займае супрацоўніцтва з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Шчырая зацікаўленасць і ўсведамленне ўзаемнай выгады далі магчымасць нам рэалізаваць буйныя і высокатэхналагічныя сумесныя праекты», — сказаў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка заявіў, што Беларусь з задавальненнем будуе і развівае свае адносіны з Кітаем, нягледзячы на геаграфічную аддаленасць у тысячы кіламетраў.

Перад адлётам са сталіцы Кітая Аляксандр Лукашэнка ўсклаў вянок да Помніка народным героям. На гэтым афіцыйная праграма візіту завяршылася.

**Паводле БЕЛТА.**

## Парламенцкі дзённік

### Нашы інтарэсы — прадстаўлены

Пасяджэнне ПА АБСЕ праходзіць у Македоніі

**Віктар ГУМІНСКІ, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, прымае ўдзел у восеньскім пасяджэнні Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, якое праходзіць з 30 верасня па 2 кастрычніка 2016 года ў Скоп'е (Македонія). Пра гэта паведамляе прэс-служба ніжняй палаты.**

«Падчас мерапрыемства пройдзе парламенцкая канферэнцыя «Узмацненне мер па ўмацаванні даверу і эфектыўнае кіраванне ў рэгіёне АБСЕ», пасяджэнне Пастаяннага камітэта ПА АБСЕ і Міжземнаморскі форум», — гаворыцца ў прэс-паведамленні. Віктар Гумінскі выступіць у ходзе парламенцкай канферэнцыі на тэму «Эфектыўнае кіраванне ў якасці асновы для стымулявання эканамічнага развіцця ў рэгіёне АБСЕ».

Падчас восеньскага пасяджэння ПА АБСЕ плануецца правядзенне сустрэч з кіраўніцтвам Асамблеі, парламентарыямі дзяржаў — удзельніц АБСЕ, службовымі асобамі Міжнароднага сакратарыята ПА АБСЕ. У цэнтры ўвагі на сустрэчах з кіраўніцтвам арганізацыі будзе пытанне аб правядзенні ў 2017 годзе ў Мінску 26-й штогадовай сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

## Грамадская супольнасць

### Спяшацца ствараць партыю не трэба

**Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Белая Русь» не бачыць неабходнасці ў тым, каб станавіцца партыяй. Аб гэтым кіраўнік рэспубліканскага грамадскага аб'яднання Аляксандр РАДЗЬКОЎ заявіў у размове з дэлегацыяй Кобрынскай раённай арганізацыі Белай Русі ў штаб-кватэры аб'яднання. Па яго словах, нягледзячы на тое, што ў шэрагах аб'яднання практычна 165 тысяч членаў, якія маюць актыўную палітычную пазіцыю, сёння ўсё яшчэ складана казаць пра тое, каб станавіцца партыяй.**

«У грамадскага аб'яднання каласальны палітычны вопыт. На яго рахунку парламенцкія выбары 2008, 2012 гадоў, выбары дэпутатаў мясцовых Саветаў 2010 і 2014 гадоў, выбары Прэзідэнта ў 2010 і 2015 гадах. Не стаў выключэннем удзел членаў грамадскага аб'яднання ў сёлетніх выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Падчас парламенцкіх выбараў грамадскае аб'яднанне наведвалі назіральнікі з АБСЕ і ПАСЕ. Для іх было цікава, што мы настолькі арганізаваныя аб'яднанне і пры гэтым не з'яўляемся партыяй, але функцыянуем па партыйным прынцыпе. Са стварэннем партыі сёння не трэба спяшацца. Пра гэта можа быць гаворка, толькі калі з'явіцца адпаведная патрэба і матывацыя», — растлумачыў Аляксандр Радзькоў.

Таксама з кобрынскімі калегамі абмяркоўваліся пытанні дзяржаўнага і грамадскага жыцця краіны, перспектывы развіцця аб'яднання. Акрамя таго, члены арганізацыі падвялі вынікі сваёй работы ў перыяд парламенцкіх выбараў і ўнеслі прапановы па ўдзелу ў выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў.

У канцы пасяджэння Аляксандр Радзькоў прыняў у шэрагі арганізацыі новых удзельнікаў і ўручыў ім членскія білеты. «Такія сустрэчы не толькі вучаць і аб'ядноўваюць членаў арганізацыі, але і даюць імпульс да далейшага развіцця», — адзначыў кіраўнік аб'яднання.

Далей члены дэлегацыі пазнаёміліся з дзейнасцю Фрунзенскай раённай арганізацыі і наведалі шэраг сацыяльных і гістарычных аб'ектаў Мінска.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*Kryzhevich@zviazda.by*

## Гарадская гаспадарка

### «ПРАЙДУ ПА АБРЫКОСАВАЙ, ЗБОЧУ НА ВІНАГРАДНУЮ...»

У сталіцы з'явяцца алеі з цікавымі назвамі

**Пасадка дрэў будзе прымеркавана да месячніка па добраўпарадкаванні і азеляненні гарадскіх тэрыторый, які пройдзе з 1 кастрычніка па 1 лістапада. За гэты перыяд зялёная зона ў кожным раёне павінна папоўніцца 4-5 алеямі. Жадаючыя асабіста паўдзельнічаць у добраўпарадкаванні свайго горада могуць знайсці графік высадкі дрэў на сайтах раённых адміністрацый.**

Усе алеі будуць насіць тэматычныя назвы: ад патрыятычных — Перамогі, Памяці (Заводскі раён), Ветэранаў (Ленінскі раён), Герояў працы (Партызанскі раён), да кранальных — Кахання (Заводскі раён), Добрых людзей (Першамайскі раён). Асаблівая ўвага ўдзяляецца тэме моладзі і спорту: алеі з такімі назвамі з'явяцца адразу ў некалькіх раёнах горада. Не менш папулярная і тэма сям'і: Алея Шматдзетных маці (Ленінскі раён), Маладажонаў, Сям'і, Пакаленняў (Кастрычніцкі раён). Дарэчы, у высадцы алей будуць задзейнічаны ў тым ліку тыя, хто згаданы ў яе назве. Напрыклад, пры закладцы Школьнай алеі возьмуць у рукі рыдлёўкі школьнікі, Футбольнай — футбалісты.

Аднак стварэнне новых «зялёных тэрыторый» у межах горада не адзінае, чым будзе адзначаны маючы адбыцца месячнік па добраўпарадкаванні. Падчас яго правядзення будуць ліквідавацца наступствы ліпеньскага ўрагану: на месцах паваленых дрэў з'явяцца саджанцы. Усяго ж у планах пасадка за месяц 10 тысяч дрэў і 3 тысяч кустоў.

**Дар'я КАСКО,** *kasko@zviazda.by*


Минский городской центр недвижимости

**Государственное предприятие «МГЦН»**

**сообщает о внесении следующих изменений в извещение о проведении 25 октября 2016 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Электромодуль» (опубликовано в газете «Звязда» 24.09.2016):**

вместо слов «прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 12.04.2016 по 11.05.2016 включительно» следует читать: **«прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 03.10.2016 по 21.10.2016 включительно».**

Телефон для справок +375 (17) 327 48 36.
Адрес в сети интернет: www.mgcn.by.

УНП 190398583

Уважаемые акционеры ОАО «Белкотлоочистка»!

**Внеочередное общее собрание акционеров состоится**

**11 октября 2016 года, начало собрания 10.00.**

**Место проведения – г. Минск, ул. Аранская, 22а.**
**Регистрация проводится с 9.00 до 9.45 (при себе иметь паспорт)**

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. Утверждение Устава ОАО «Белкотлоочистка» в новой редакции.
2. Передача полномочий исполнительного органа ОАО «Белкотлоочистка» управляющей организации ООО «ПРАЙМ ЕВРО ИНВЕСТ».

УНН 100071353 *Наблюдательный совет. Тел. для справок (017) 298-27-57*


## Добрая навіна

### Камфортна і прыгожа

**102 малышы пераступілі парог новага дзіцячага сада, які адкрыўся ў гарадскім пасёлку Мір.**



Фота grodnonews.by

У гэтай дашкольнай установе, якая разлічана на 130 месцаў для дзяцей з пасёлка і навакольных вёсак, будзе 7 груп, у тым ліку ясельная. У параўнанні з ранейшымі ўмовамі (групы былі перапоўненыя, не мелі медпункта, ежу гатавалі ў іншым будынку) сітуацыя кардынальна змянілася. Цяпер з'явіўся прыгожы будынак, дзе ўсё на сучасным узроўні. У прыватнасці, ёсць медыцынскі блок, дзе для выхаванцаў будзе праводзіцца шмат прафілактычных працэдур, музычная і спартыўная залы, басейн.

За апошнія 5 гадоў на Гродзеншчыне адкрыліся 24 установы для дзяцей — 5 школ, 10 дзіцячых садоў, 9 дзіцячых дамоў сямейнага тыпу.

— Штогод мы прыкладаем усе намаганні для таго, каб дзеці выхоўваліся ў належных умовах, — зазначыў **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар ЛІСКОВІЧ.**

Дарэчы, і ён, і **старшыня Карэліцкага райвыканкама Віктар ШАЙБАК** прыйшлі на ўваходзіны дзіцячага сада з падарункамі. Ад аблвыканкама — абсталяванне для камп'ютарнага класа, ад раённага выканаўчага камітэта — мультымедыйная ўстаноўка.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*prakopchik@zviazda.by*

## Трэці ўзрост

# Жыць доўга і якасна

**У адпаведнасці з геранталагічнай класіфікацыяй людзі ад 60 да 75 гадоў лічацца пажылымі, узрост вышэй за 75 — старэчы, а з 90 гадоў грамадзяне становяцца доўгажыхарамі. У Беларусі на пачатак бягучага года налічвалася 2,4 млн пенсіянераў. Пры гэтым 456 чалавек — старэйшыя за 100 гадоў, а чацвёра пражылі ўжо больш за 110 гадоў.**

**У пэўным узросце ў жыцці пажылога чалавека самым надзённым становіцца яго здароўе. Людзі ў нашай краіне сталі жыць даўжэй, і колькасць пажылых павялічваецца. Разам з тым расце і аб'ём медыцынскай дапамогі пенсіянерам, захваральнасць у якіх значна вышэй, чым у працаздольных людзей.**

### 3—5 хранічных захворванняў — у кожнага пажылога

*— Так устроены наш менталітэт, што клапаціцца пра сваё здароўе людзі пачынаюць позна і часцей за ўсё прыходзяць да пажылога ўзросту, маючы 3—5 хранічных захворванняў,* — расказала **Людміла ЖЫЛЕВІЧ, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік аддзела першаснай медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Беларусі.** — *Дарэчы, фактараў рызыкі ў пажылым узросце значна менш, чым у больш маладым. Падыходзячы да пенсіі, чалавек, нарэшце, успамінае пра здароўе, задумваецца, што настаў час кінуць курыць, аднак хранічнае захворванне ў яго ўжо ёсць.*

На першым месцы сярод хранічных — захворванні сардэчна-сасудзістай сістэмы, на другім — хваробы органаў стрававання, на трэцім — касцёва-мышачнай сістэмы. Ад гэтых немачаў пажылыя ў параўнанні з людзьмі працаздольнага ўзросту пакутуюць больш адпаведна ў чатыры, пяць і два разы. Акрамя таго, у пажылых у пяць разоў часцей выяўляюць злаякасныя ўпершыню ўстаноўленыя новаўтварэнні.

*— Сістэма аховы здароўя поўнасцю гатовая да таго, каб падаць руку пажылому ў яго бядзе. Чалавек, незалежна ад узросту і полу, мае права на аднолькавае медыцынскае абслугоўванне. Трансплантацыя сэрца, замена суставаў, аўтакаранарнае шунціраванне, пратэзаванне робіцца ў любым узросце. Дзякуючы высокім тэхналогіям у медыцыне, людзі аднаўляюць якасць жыцця нават пры цяжкіх захворваннях,* — выказалася прадстаўніца міністэрства. — *Няхай пажылыя і непрацаздольныя ў поўным сэнсе гэтага слова праз свой узрост, аднак яны маюць актыўную жыццёвую пазіцыю, абслугоўваюць сябе і дапамагаюць дзецям і ўнукам.*

### Комплексная дапамога: урачы, валанцёры, псіхолагі і царква

Каб навучыць пажылых жыць з іх захворваннямі, вызначыць магчымасці для захавання якасці свайго жыцця, пры ўсіх амбулаторна-паліклінічных арганізацыях ствараюцца школы трэцяга ўзросту, якія з'яўляюцца навучальнымі цэнтрамі для пажылых. Такіх устаноў працуе ўжо больш за 630.

Асаблівая ўвага надаецца развіццю геранталогіі і герыятрыі.

*— Мы ўскладаем надзеі на развіццё новых кірункаў у герыятрыі, пошук новых шляхоў захавання здароўя і актыўнага даўгалецця. Таму на базе Рэспубліканскага цэнтра герыятрыі, які працуе ў садружнасці з кафедрай герыяталогіі і герыятрыі Беларускай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, будзе створаны цэнтр актыўнага даўгалецця. Тут будуць распрацоўвацца медыцынскія методыкі, каб людзі не проста доўга жылі, а як мага даўжэй захоўвалі здароўе і якасць жыцця.*

Пры рабоце з пажылымі вельмі важна комплекснасць падыходу, таму сацыяльныя службы і медыкі працуюць поруч. Актыўна дапамагаюць прадстаўнікі Чырвонага крыжа, царквы. Вельмі важнай бачыцца і дапамога валанцёраў: студэнтаў і звычайных грамадзян.

*— Практычна ўсе буйныя арганізацыі, у тым ліку былыя шпіталі, цяпер маюць у складзе персаналу псіхолагаў, якія актыўна працуюць з пацыентамі. Часта вырашэнне пэўных псіхалагічных праблем дае вельмі добры вынік у плане захавання здароўя,* — дадала Людміла Жылевіч.

У Беларусі працуе 104 бальніцы сястрынскага догляду з добрай матэрыяльна-тэхнічнай базай і прафесійным персаналам. Пажылыя, якія маюць інваліднасць ці знаходзяцца ў складанай жыццёвай сітуацыі, могуць стабілізаваць тут свой стан. Грамадзяне знаходзяцца ў бальніцах, як правіла, у асноўным у зімовы сезон, а вясной вяртаюцца дахаты, заўважыла спецыяліст.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

■

## Будзьце пільнымі!

# ВЫКРАДАЛЬНІКІ АБРАЗОЎ

**У Брэсцкай вобласці заведзены дзве крымінальныя справы па фактах выкрадання абразоў з жылых памяшканняў. Як расказала афіцыйны прадстаўнік УСК па Брэсцкай вобласці Марына ДРАНЬКОВА, культавыя прадметы ўкралі з дамоў, у якіх цяпер ніхто не жыве, але ў летні перыяд яны выкарыстоўваюцца ў якасці дач.**

У вёсцы Леснікі Драгічынскага раёна зламыснікі пранікі ў дом, адціснуўшы рыгель уваходных дзвярэй. Яны абшукалі ўсе памяшканні, перавярнулі ўсё ў шафах, нават з кветкавых гаршкоў змесціва павысыпалі. Але забралі толькі насценны гадзіннік з маятнікам і абраз Мікалая Цудатворца. Названая выява святога была выканана на драўлянай дошцы. Ці ўяўляе яна гістарычную і культурную каштоўнасць, зараз высвятляецца.

Мясцовыя жыхары расказалі праваахоўнікам, што напярэдадні ў вёску прыязджалі незнаёмыя людзі неславянскай знешнасці, пыталі, ці не прадасць хто металалом.

Другі аналагічны крадзеж зафіксаваны ў вёсцы Тэўлі Кобрынскага раёна. Злодзеі выврвалі прабой, зайшлі ў хату, абшукалі дом і вынеслі абраз Божай Маці, які вісеў на сцяне.

Марына Дранькова падкрэсліла, што следчыя просяць жыхароў быць пільнымі да фактаў паяўлення ў вёсках незнаёмых людзей, якія прапаноўваюць сумніўныя здзелкі. Аб такіх няпрошаных гасцях варта паведамляць у міліцыю.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■


**РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 12 октября 2016 г. в 10.00 повторного открытого аукциона по продаже автотранспортного средства, принадлежащего Гомельскому областному управлению по надзору за рациональным использованием топливно-энергетических ресурсов на праве оперативного управления**

| № лота | Наименование предмета торгов, краткая характеристика | Начальная цена, руб. (без НДС) | Задаток, руб. (без НДС) |
|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль Рено Эспейс (RENAULT ESPACE), рег. знак 1033 АН-3, год выпуска – 2001, цвет – темно-синий металлик. Номер кузова (рамы): VF8JE0K0525448220. Тип: легковой специальный мини-вэн. Вид топлива – ДТ. Объем двигателя – 2198 см.куб. | **3 887, 88** *(справочно: начальная цена без учета деноминации* 38 878 785 рублей) | **388,78** *(справочно: сумма задатка без учета деноминации* 3 887 800 рублей) |

**Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Шаг аукциона – 10%.**

Аукционные торги проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12 июля 2013 г. № 609.

Продавец вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5%.

Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 11 октября 2016 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 9.00 до 10.00 **12 октября 2016 г**.

**К заявлению на участие в аукционе прилагаются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет Организатора торгов, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или трудовой договор (контракт), или иные документы в соответствии с законодательством).

В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с 3012230570008 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, код 153001270. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 01 октября 2016 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (единственным участником, выразившим согласие купить предмет торгов), будет засчитан в счет окончательной стоимости предмета торгов. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (единственным участником, выразившим согласие купить предмет торгов), Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (единственный участник, выразивший согласие купить предмет торгов) обязан**: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона возместить Организатору затраты на организацию и проведение аукциона, об утвержденной сумме которых уведомляется перед началом аукциона; в течение 10 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов; в течение 10 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи выплатить Продавцу стоимость предмета торгов, сформированную в установленном порядке.

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его победителем (единственным участником, выразившим согласие купить предмет торгов) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет десять базовых величин за каждый случай нарушения.

*Извещение о предыдущих несостоявшихся торгах по данному лоту было опубликовано в газете «Звязда» от 17.08.2016 г. № 157.*

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. ☎ 8 (0232) 70-46-47; 75-50-76 • www.gino.by • e-mail: info@gino.by**
**Продавец: областное управление по надзору за рациональным использованием топливно-энергетических ресурсов, г. Гомель, ул. Крестьянская, 31. ☎ 8 (029) 639-89-87; 608-87-99 •**


## У люстэрку статыстыкі

# МУЖЧЫН СЯРОД НАСТАЎНІКАЎ ТОЛЬКІ 14 ПРАЦЭНТАЎ

**Па звестках Белстата, у сістэме адукацыі занята амаль 10 працэнтаў насельніцтва Беларусі.**



Прафесія педагога — адна з самых масавых, сцвярджаюць у Нацыянальным статыстычным камітэце. У Беларусі функцыянуе каля 8 тысяч устаноў дашкольнай, агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.

Школьныя настаўнікі ў агульнай «арміі» педагогаў складаюць большую частку.

Прафесія настаўніка мае ў нашай краіне ярка выражанае жаночае аблічча. На пачатак 2015/2016 навучальнага года доля жанчын-настаўнікаў дасягала 86 працэнтаў у агульнай колькасці, а сярод дырэктараў і іх намеснікаў жанчын налічвалася 85 працэнтаў.

93 працэнты настаўнікаў атрымалі вышэйшую адукацыю. Больш як 76 працэнтаў з іх маюць вышэйшую і першую кваліфікацыйную катэгорыю.

Нагрузка на настаўнікаў у гарадскіх і сельскіх школах адрозніваецца. Так, у мінулым навучальным годзе на аднаго настаўніка у гарадскіх школах прыпадала ў сярэднім 10 вучняў, а ў сельскіх — толькі 5 вучняў.

У дзяржаўных установах агульнай сярэдняй адукацыі працуюць 99,8 працэнта настаўнікаў, 72 працэнты з іх — на пасадзе настаўніка-прадметніка.

У 2015/2016 навучальным годзе ўсімі ўстановамі адукацыі краіны было выпушчана каля 10 тысяч будучых педагагічных работнікаў. Пры гэтым 83 працэнты з іх — з вышэйшай адукацыяй. Кожны дзясяты студэнт, які навучаецца ў ВНУ, атрымлівае педагагічную спецыяльнасць.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■

## З нагоды

# ПЛЮС АТЛАС У ПАДАРУНАК

**Беларускія школы менавіта да 2 кастрычніка атрымаюць новае выданне — геаграфічны атлас настаўніка. Аб гэтым на пасяджэнні калегіі Дзяржкаммаёмасці Беларусі паведаміў дырэктар РУП «Белкартаграфія» Мікалай ВЯРЗУН.**

Як адзначыў **старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Андрэй ГАЕЎ**, асаблівасць атласа ў тым, што ў ім упершыню сабрана больш за 700 картаграфічных твораў самай рознай накіраванасці. Ён будзе цікавы і тым, хто вучыцца, прычым на самых розных ступенях, і выкладчыцкаму саставу, і ў цэлым усім, хто цікавіцца геаграфіяй, картаграфіяй, эканомікай і астраноміяй.

Атлас уяўляе сабой комплексны картаграфічны твор, які змяшчае навуковую інфармацыю аб Зямлі, фізіка-геаграфічных, палітычных і сацыяльна-эканамічных асаблівасцях свету ў цэлым, асобных краін і рэгіёнаў. Атлас настаўніка ўжо надрукаваны, а цяпер вядзецца яго пераплёт. «Усяго выдадзена 3,5 тысячы экзэмпляраў. Яшчэ 350 будзе выдадзена крыху пазней — гэтыя экзэмпляры паступяць у гандлёвую сетку. Потым, у залежнасці ад попыту, будзе выдадзены яго дадатковы тыраж», — сказаў Мікалай Вярзун.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

## Святочнае

# «ГЛУШАНСКІ ХУТАРОК» З ВЫШЫНІ ПТУШЫНАГА ПАЛЁТУ

**Сёння пасёлак Глуша Бабруйскага раёна сёмы раз запрашае гасцей на фестываль народных промыслаў і рамёстваў.**

Сёлета свята з пасялковага маштабу дарасло да раённага. Такі статус фестываль атрымаў за актыўную прапаганду народных беларускіх промыслаў і традыцый. Мясцовы вядомы кераміст Аляксандр Арлоў са сваім узорным дзіцячым калектывам «Глечыкі» стане адным з галоўных экспертаў на тутэйшым пленэры па кераміцы і ганчарстве. На фестывальнай сцэне па традыцыі пройдуць конкурсы прыпевак і беларускай песні «Я люблю цябе, Беларусь!» У праграме запланаваны шматлікія народныя гульні і атракцыёны. Аматары вострых адчуванняў змогуць паглядзець на святочную паляну з вышыні птушынага палёту. У гэтым ім дапамогуць лётчыкі Бабруйскага клуба ДТСААФ.

— Наш фестываль асабліва любяць за душэўнасць, — кажа яго ініцыятар і ідэйны натхняльнік **старшыня Глушанскага пасялковага савета Марыя СУШЧАНКА.** — Тут ніколі не бывае сумна, кожнага, хто да нас завітае, прымем з цеплынёй і радасцю. Бо разам мы — сям'я.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■

■ Першыя крокі ў прафесіі

# Настаўнік — гэта вучань, назаўсёды выкліканы да дошкі

**«Ці лёгка быць маладым?» — гэта філасофскае пытанне стала лейтматывам сустрэчы, якую арганізавалі для «навабранцаў» напярэдадні Дня настаўніка Мінскі гарадскі камітэт Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі і камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама. Штогод у армію сталічных педагогаў уліваецца ад 700 да 800 выпускнікоў педагагічных спецыяльнасцяў. Пытанняў у маладых спецыялістаў узнікае шмат. Напрыклад, усіх, без выключэння, цікавіць, ад якіх фактараў залежыць іх заработная плата? Ці можна паўплываць на яе памер? З якім стажам педагог можа прэтэндаваць на кваліфікацыйную катэгорыю? Як выстраіць узаемаадносіны з дзіцячым калектывам і зрабіць бацькоў вучняў сваімі саюзнікамі? Куды ўвогуле звяртацца з пытаннямі, якія тычацца прафесійнай дзейнасці? Хто можа дапамагчы па-за сценамі тваёй школы?**

## БЕГАЦЬ, А НЕ ХАДЗІЦЬ ПЕШШУ

**Старшыня камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Міхаіл МІРОНЧЫК** палічыў сімвалічным той факт, што месцам сустрэчы з маладымі спецыялістамі стаў Мінскі гарадскі інстытут развіцця адукацыі (МГІРА).

— Спадзяюся, што кожны з вас разумее: гэта прафесія, дзе давядзецца вучыцца ўсё жыццё. Вы прыйшлі ў школу не проста дзеля таго, каб весці ўрокі, але і для таго, каб выхоўваць падрастаючае пакаленне. Прычым выхоўваць сёння трэба не толькі дзяцей. Адзін з самых складаных аспектаў у вашай рабоце — стасункі з бацькамі, — папярэдзіў Міхаіл Міронччык. — З імі вам таксама давядзецца весці штодзённую работу.

На думку кіраўніка сталічнай сістэмы адукацыі, у маладых педагогаў у горадзе ёсць шмат магчымасцяў, каб сябе праявіць. Адна з іх — штогадовы конкурс «Сталічны настаўнік — сталічнай адукацыі», дзе для старшакурснікаў педагагічных спецыяльнасцяў прадугледжана намінацыя «Педагагічны дэбют», а для педагогаў са стажам працы не больш як тры гады — намінацыя «Мы — маладыя».

— У вас ёсць усё — маладосць, крэатыўнасць, ініцыятыўнасць, таму не бойцеся пра сябе заяўляць. Мае маскоўскія калегі выказалі думку, што прафесія педагога — кар'ернатупіковая, маўляў, з сотні педагогаў толькі 3-4 чалавекі становяцца кіраўнікамі. Гэта насамрэч так, але астатнія 95—97 маюць усе шанцы стаць высакакласнымі спецыялістамі, — падкрэсліў Міхаіл Міронччык. — Іх будучь паважаць, да іх меркавання будуць прыслухоўвацца, бацькі будуць імкнуцца ўладкаваць сваё дзіця ў клас менавіта да такога педагога. Таму ўсё залежыць толькі ад вас саміх. Кожны год мы знаходзім сярод педагогаў пару дзясяткаў новых імёнаў, і пра іх вельмі хутка даведваюцца не толькі ў нашым горадзе.

— Мы ўсе вучні, назаўсёды выкліканыя да дошкі: перастанеш вучыцца, не зможаш вучыць. Маладосць — гэта асаблівы час. Калі вы — маладыя, то не будзеце хадзіць пешшу, таму што можаце бегаць. Маладосць далёкая ад дасканаласці, але яна страсна імкнецца да яе, — падзялілася сваімі думкамі **намеснік начальніка аддзела арганізацыйнага і метадычнага суправаджэння конкурснага руху і педагагічных ініцыятыў МГІРА Таццяна ПАЎЛЮЧУК.** — Маладц настаўнік — дзіўнае спалучэнне: гэта і невынішчальная прага навізны, і несакрушальная сіла, і палёт думак, які можа разбурыць усе перашкоды. Няма сумненняў, што маладым настаўнікам быць не проста, але менавіта маладыя, поўныя энергіі і аптымізму, будуць вучыць дзяцей не толькі скланяць, спрагаць, складаць і аднімаць, але і бачыць прыгажосць, здзіўляцца ёй і дарыць яе людзям.




Сяргей КУРЫЛОВІЧ: «Сёння я магу прадстаўляць інтарэсы многіх».

> **«З 44 маладых педагогаў-майстроў, якія ўліліся ў сістэму прафтэхадукацыі, 38 пайшлі служыць увосень, а яшчэ чатыры чалавекі адправіліся на службу вясной».**

Дарэчы, калі малады педагог амбіцыйны, калі ён удзельнічае ў конкурсах прафесійнага майстэрства, то можа прэтэндаваць на заўчаснае прысваенне яму больш высокай катэгорыі, ад якой залежыць і яго заробак. Скажам, для таго каб атрымаць другую кваліфікацыйную катэгорыю, учарашняму выпускніку педагагічнай спецыяльнасці не давядзецца чакаць два гады. А можна замахнуцца і на першую...

## БЛІСНУЦЬ ІДЭЯЙ

2—4 лістапада ў гарадскім адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Лідар» пад Мінскам пройдзе ўжо пяты адкрыты Мінскі маладзёжны фестываль педагагічных ідэй і рашэнняў. Патрабаванняў да мінімальнага прафесійнага стажу на фестывалі не вызначана, таму стаць яго ўдзельнікамі могуць і зусім юныя педагогі з двухмесячным вопытам работы, якія толькі-толькі прыступілі да яе. А вось верхняя планка ёсць — тры гады работы ў сістэме адукацыі.

Сваім досведам удзелу ў фестывалі падзяліўся **старшыня Савета маладых педагогаў устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі сталіцы, фіналіст конкурсу «Сталічны настаўнік — сталічнай адукацыі» ў намінацыі «Педагог — арганізатар» Сяргей КУРЫЛОВІЧ:**

— У першы год я паехаў на фестываль у якасці аднаго з яго ўдзельнікаў. На другі год ужо рыхтаваў каманду ад сталічнай сістэмы прафтэхадукацыі. На трэці год — быў кіраўніком каманды прафтэхадукацыі. Мяне заўважылі, запрасілі ў гарадскі Маладзёжны савет пры Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі, а сёння я з'яўляюся яшчэ і старшынёй камісіі па працы з моладдзю пры Цэнтральным камітэце галіновага прафсаюза. Што мне гэта дало? Сёння я магу прадстаўляць інтарэсы многіх...

Наш Савет маладых і гаркам прафсаюза штогод у кастрычніку арганізоўваюць сустрэчы з маладымі педагогамі сістэмы прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. На апошняй такой сустрэчы было ўзнята пытанне службы ў арміі. Усе маладыя хлопцы, адпрацаваўшы па месцы размеркавання ўсяго два месяцы, трапляюць пад асенні прызыў, а тых, хто не трапіў у асенні прызыў, чакае вясенні — праз паўгода іх работы. Так, з 44 маладых педагогаў-майстроў, якія ўліліся ў сістэму прафтэхадукацыі, 38 пайшлі служыць увосень, а яшчэ чатыры чалавекі адправіліся на службу вясной. Такім чынам ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай адукацыі засталіся толькі два маладыя педагогі-мужчыны. Шчыра скажу: шанцаў, што хлопцы вернуцца ў сістэму прафтэхадукацыі пасля арміі, няшмат. Пры падтрымцы гаркама прафсаюза мы выйшлі з гэтым пытаннем на самы высокі ўзровень. Што ў выніку? Цяпер, калі да вас прыходзіць павестка, кіраўнік установы прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі мае права звярнуцца ў ваенкамат, і вам прадаставяць адтэрміноўку ад службы ў арміі на час работы па размеркаванні. Я лічу гэта істотным дасягненнем. Да таго ж зараз разглядаецца пытанне аб магчымасці залічэння на службу ў рэзерве — зноў жа па хадайніцтве кіраўніка ўстановы адукацыі, маладых педагогаў, якія за два гады праявілі сябе высакакласнымі спецыялістамі і ў якіх ёсць перспектывы для росту. Гэта зноў жа тычыцца толькі сістэмы прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Сяргей Курыловіч падкрэслівае, што ўдзел у конкурсах і фестывалі — гэта бясцэнны вопыт, абмен ідэямі, знаёмства з аднадумцамі, калегамі з іншых рэгіёнаў і нават краін, магчымасць прафесійнага росту. «Конкурс — гэта складана, доўга, затое вельмі цікава», — канстатуе ён.

## СТУКАЙЦЕ, І ВАМ АДЧЫНЯЦЬ...

Маладыя педагогі, запрошаныя на сустрэчу, змаглі задаць свае пытанні кампетэнтным спецыялістам, напрыклад, пра тое, як фарміруецца іх тарыфная стаўка? На якую матэрыяльную дапамогу могуць разлічваць іншагародні педагогі, размеркаваныя ў сталіцу? Якія даплаты робяцца маладым спецыялістам сталічных устаноў адукацыі? Навапсечаным настаўнікам патлумачылі, як правільна павінны быць аформлены працоўныя адносіны, расказалі аб гарантыях для маладых спецыялістаў, пры магчымасць для іншагародніх трапіць у інтэрнат для педагогаў. Цяпер у інтэрнаце па вуліцы Гінтаўта, які ўяўляе сабой адзін з пад'ездаў дзевяціпавярховага жылога дома, пражываюць 124 педагогі. На жаль, на месца там могуць прэтэндаваць толькі адзінокія, а тыя, хто стварыў сям'ю, вымушаны ўжо самастойна шукаць дах над галавой. Чарга ў інтэрнат, як запэўнілі, невялікая (ад 6 да 8 чалавек), гэта лічба змяняецца, у залежнасці ад таго, як змяняецца сямейны статус яго жыхароў. Таму трапіць сюды цалкам рэальна.

**Аляксандр ШЧАКОВІЧ, намеснік старшыні Мінскага гарадскога аб'яднання арганізацый прафсаюзаў,** які падводзіў вынікі сустрэчы, пажартаваў: «Я не ведаю, хто вам параіў выбраць прафесію настаўніка, але вы выбралі архіскладаную прафесію і разам з тым архіважную. Затое ў вас ёсць адна вельмі важная перавага. Калі я працаваў у БДУІР, ад нас сыходзіў на пенсію першы прарэктар, ужо немалады чалавек. І ён прызнаўся, што вельмі баіцца пастарэць, што я, шчыра кажучы, не адразу зразумеў. Сказаў, што штацоўшы магчымасць штодзённых стасункаў са студэнтамі, пастарэе вельмі імкліва. Дык вось, у вас ёсць магчымасць заставацца ў душы заўсёды маладымі, расці і развівацца разам са сваімі вучнямі. Самае галоўнае — не забывайце, што дзверы не адчыняцца, пакуль вы ў іх не пастукаеце. Таму не чакайце, а дзейнічайце...»

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

## Парады маладым педагогам

- ✓ Ніколі не спазняйцеся на ўрок.
- ✓ Распачніце ўрок з пытання, парадоксу ці загадкі.
- ✓ Выкарыстоўвайце ў працэсе навучання «жывыя прыклады».
- ✓ Арганізуйце на ўроках дыскусіі, падзяліўшы ўдзельнікаў на абаронцаў выказанай думкі і праціўнікаў.
- ✓ Папрасіце вучняў зрабіць самастойныя высновы, даўшы ім процілеглую інфармацыю.
- ✓ Працуйце ў камандзе. Настаўнікам проста неабходна аб'ядноўваць свае сілы. Пры зладжанай рабоце педагагічнага калектыву эфектыўнасць выхаваўчага і адукацыйнага працэсаў узрастае ў геаметрычнай прагрэсіі.
- ✓ Звяртайце ўвагу на парады больш дасведчаных калег, але рабіце самастойныя высновы. Лепш прыслухацца да парады і пераглядзець, што з гэтага атрымаецца, чым праігнараваць і атрымаць уласны досвед цаной проб і памылак.
- ✓ Не бярыце на сябе занадта многа. Патрабуйце дакладнага вызначэння пераліку вашых абавязкаў.
- ✓ Не прасіце прабачэння за «лішнія» пытанні. Вы павінны ведаць, што вы робіце, таму лепш заўсёды запытацца, калі вы ў чымсьці няўпэўнены.
- ✓ Умейце быць гібкімі. Можна выйграць бой, але прайграць вайну.
- ✓ Не стаўцеся да школы проста як да месца работы.
- ✓ Атрымлівайце задавальненне ад стасункаў з дзецьмі і калегамі.
- ✓ Захоўвайце пачуццё гумару.
- ✓ Радуйцеся поспехам, але памятайце, што без няўдач пражыць немагчыма.


И З В Е Щ Е Н И Е  О  П Р О В Е Д Е Н И И  А У К Ц И О Н А

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства**

**ЛОТ №1:** Капитальное строение с инв. № 700/С-49231 – здание производственного корпуса, расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Ровчакова, 18, общ. пл. 2815,3 кв.м, фундамент здания – ж/бетонный, стены – кирпичные, панельные, перекрытия – ж/б, кровля – рулонная.
Сведения о земельном участке: в составе земельного участка с кадастровым номером 740100000001004583 (право постоянного пользования), расположенного по адресу: г. Могилев, ул. Ровчакова, 18, площадь 2,3472 га, назначение – земельный участок для содержания и обслуживания производственной базы.

**Начальная цена продажи 188 320,70 рубля. Сумма задатка 18 832,07 рубля**

| | |
|---|---|
| Расчетный счет для перечисления задатка | Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», ЦБУ № 703 г. Минска, МФО 153001369 |
| Дата, время и место проведения аукциона | **Аукцион проводится 08 ноября 2016 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 99, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 04 ноября 2016 года до 15.00 |
| Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества | В течение двух месяцев и двадцати дней с момента подписания протокола аукциона на расчетный счет Организатора аукциона разовым платежом либо траншами |

Для участия в аукционе участник в установленный срок должен представить Организатору:

- заявление на участие в аукционе; - копию платежного документа о перечислении задатка; - паспорт; - индивидуальные предприниматели и юридические лица – резиденты Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; - юридические лица – нерезиденты Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предоставляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

Участник, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в соответствии с Соглашением, которые подлежат уплате в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона.

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: (8-0222) 32-43-98, (8-0291) 400-394; 8-029-624-26-25.**

# ПАД ПЕСНІ СВАЁЙ МАЛАДОСЦІ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На дыскатэцы дзейнічае дрэс-код. Толькі вячэрнія ўборы, ніякіх джынсаў. Таму на сённяшняе мерапрыемства Тацццяна Адамаўна Багдановіч выбрала сукенку ў падлогу, яркую памаду і бліскучае кальё. На свае 75 гадоў яна выглядае модала. «Бо не сяджу на месцы», — тлумачыць нам. Тацццяна Адамаўна займаецца танцамі, выступае з хорам і захапляецца скандынаўскай хадой. Прачынаецца а шостай гадзіне раніцы і праходзіць з палачкамі па тры-чатыры кіламетры.

На дыскатэку пенсіянерка прыйшла з сяброўкамі.

— Мужчын на танцах заўсёды мала, — уздыхае яна. — І тыя — занятыя. Але мы стараемся не сумаваць.

Стаяць адной эфектнай жанчыне доўга не прыйшлося. Ужо праз некалькі хвілін на танец запрасіў кавалер. Праўда, вядзе ў пары сама Тацццяна Адамаўна: відаць, адбіваецца яе спартыўная падрыхтоўка.

Віктар Паўлавіч Крыловіч і Аляўціна Васілеўна Навоева прыйшлі на восенькі бал разам. Не, не жанатыя. Абое ўдаўцы, пазнаёміліся тры гады таму. На танцах бываюць кожную нядзелю. «Нас заўсёды заўважаюць і хваляць», — без лішняй сарамлівасці кажа Аляўціна Васілеўна.

Яе харызматычны спадарожнік рухаецца вельмі ўпэўнена. Раней, прызнаецца, крыху займаўся бальнымі танцамі. Больш пагутарыць з Віктарам Паўлавічам не ўдалося: нейкая брунетка пацягнула яго на паркет.

— Не, вось прыйшла з мужам, няхай з ім і танцуе. Паквапілася на майго партнёра! — абураецца Аляўціна Васілеўна і адразу ж, як песня скончылася, нецярпліва зрываецца з месца: — Пайду забіраць, а то звядуць.

Марыя Уладзіміраўна Ленюкова толькі што адскакала «Цыганачку». Кажа, гэта яе каронны нумар. У касцюме віннага колеру з вялікай белай брошкай — не заўважыць гэту даму немагчыма.

— Вядома, сачу за модай, — усміхаецца яна. — Ці часта хаджу па крамах? Не. Ведаеш, муж мяне песціў — столькі адзення ў шафах засталося. А вось абутак новы люблю. Туфлі — мая слабасць. Вось гэтыя (паказвае серабрыстыя басаножкі. — **Аўт.**) мне сяброўка прывезла з Нью-Ёрка.

На балі Марыя Уладзіміраўна без спадарожніка. І новых знаёмстваў заводзіць не хоча.

— Я пражыла прыгожае жыццё. У мяне трое дзяцей, шэсць унукаў і тры праўнукі. І восем гадоў няма мужа... Не цягне мяне да мужчын. Тым больш годных не бачу.

А вось з Леанідам Іванавічам Чарненкам, спрытным пенсіянерам, якому далёка за 70, жанчыны на падобных вечарах знаёмяцца часта. Дый з танцорам аргенцінская танга не можа быць інакш.

Дыскатэкі мужчына любіць. Ездзіць на танцпляцоўку ў Парк Чалюскінцаў. Але скардзіцца, што «нікуды яна не годная».

— Там усё тратуарнай пліткай выкладзена. Як на такім пакрыцці можна нармальна танцаваць вальс? Не слізгае, у жанчын абцасікі пастаянна захрасаюць... Просім, каб старую пляцоўку вярнулі. Ужо некалькі гадоў нам не абяцаюць.

У ідэале, выказваецца пенсіянер, на танцполе павінна быць не толькі добрае пакрыццё, але яшчэ і культарганізатар. Каб паказваў, як правільна рухацца. «Цяперашній моладзі гэта не зразумець, а мы любілі збірацца і танцаваць вальс ці факстрот. Такімі былі дыскатэкі ў нашу маладосць».

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*



Фота Надзеі БУЖАН.

# У ШКОЛЕ АДНОЛЬКАВЫХ ДЗЁН НЕ БЫВАЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дарэчы, і сапраўдныя нарады ў кабінеце дырэктара справа даволі частая. Пераважна з намеснікамі, як штотыднёвыя па графіку, так і тэрміновыя, штодзённыя. Не праходзіць і 10 хвілін, як у кабінет дырэктара нехта заходзіць з чарговай просьбай, скаргай або прапановай. Але ж акрамя надзённых спраў ёсць яшчэ велізарны пласт дакументаў.

— Часам я прашу сакратара хоць бы гадзіну нікога да мяне не пускаць, выключэнне толькі калі нельга адкласці. Я ніколі нічога не падпісваю не гледзячы. Мне трэба паглыбіцца ў сутнасць таго, што я чытаю, зразумець. Гэта ж тычыцца і ўсіх указаў і дырэктыў, — расказвае Ірына Валер'еўна, паказваючы акуратныя папкі, якія мільгаюць каляровымі стыкерамі са шматлікімі паметкамі.

## Гонар за выбар прафесіі і ўсяго адзін мінус

Дарэчы, адміністрацыйныя абавязкі не перашкаджаюць Ірыне Валер'еўне вылучаць час для свайго сапраўднага паклікання — выкладання.

— Наогул мая любоў — гэта матэматыка. Вельмі люблю і сама разбірацца ў гэтым прадмеце і вывучаць яго разам з дзецьмі. Аднак гэта навука, якая патрабуе глыбокага пагружэння, пастаяннай увагі, таму за яе ў гэтых абставінах я браца не рашаюся. Выкладаю інфарматыку ў 6—7-х класах. Якраз бліжэй знаёмлюся з дзецьмі ў пачатку іх шляху ў якасці сапраўдных гімназістаў, якія вытрымалі ўступныя выпрабаванні і першы год вучобы. Атрымліваецца, што яны ўсе «праходзяць праз мае рукі», — усміхаецца Ірына Валер'еўна. — Не магу ўявіць сваё жыццё без урокаў. Што я буду ведаць пра дзяцей і пра жыццё гімназіі, калі сустракацца з вучнямі буду толькі на лінейках?

Гучны званок перапыняе нашу гутарку — надышоў час адпраўляцца на ўрок. Шосты клас ужо заняў свае месцы за камп'ютарамі. На ўсіх дзецях аднолькавыя бардовыя камізэлькі з эмблемай — адметны элемент формы гімназістаў.

— Адкрываем тэст па мінулай тэме.

— На ацэнку? А можна паўтарыць? Вы нам крыху дапаможаце? — засыпаюць Ірыну Валер'еўну пытаннямі вучні.

Відаць, што дзеці адчуваюць сябе абсалютна спакойна і ўпэўнена. І гэта нездарма: дырэктар размаўляе з дзецьмі спакойна, з цёплай усмешкай, да кожнага звяртаецца па імені.

— Многія мне потым прызнаюцца: мы вас зусім іншай уяўлялі! На мой погляд, калі дзіця можа само без страху прыйсці ў кабінет дырэктара са сваёй праблемай, работа вядзецца правільна. Я з радасцю ўздыхаю кожны раз, калі чую нясмелы стук у дзверы, — дзеліцца сакрэтамі Ірына Валер'еўна.

Пасля ўрока — «рэйд» у сталовую: трэба асабіста праверыць, як сёння кормяць.

— На самай справе, маё ўяўленне аб рабоце дырэктара, пакуль я была настаўніцай і нават намеснікам, вельмі моцна адрознівалася ад рэальнасці. Дырэктар школы — гэта, як ні дзіўна такое чуць, у першую чаргу гаспадарнік, на ім адказнасць за дакладнае функцыянаванне складанага механізму з пункту гледжання практычнай рэалізацыі. Звышідэя і выбар кірункаў развіцця — бясконца важныя, аднак рэальнае жыццё часта прымушае задумвацца аб больш надзённых рэчах.

Я не магу ацэньваць сваю працу ў якасці дырэктара школы, мне здаецца, гэта прэрагатыва вучняў, іх бацькоў і працоўнага калектыву. Аднак я бясконца ганаруся, кажу гэта шчыра, тым, што выбрала прафесію настаўніка. Якое задавальненне бачыць, як з маленькіх, дурасліўых і наіўных дзяцей вырастаюць дарослыя, сур'ёзныя, матэнакіраваныя маладыя людзі. А як цікава працаваць з сучаснымі дзецьмі! Яны ж зусім іншыя: са сваёй выразна выяўленай пазіцыяй, смелыя і адкрытыя. І справа не ў тым, што ў нас добрыя дзеці, хоць гэта і прыемна, а ў тым, што ў цэлым жыццё змяняецца, і я не магу сказаць, што ў горшы бок.

На пытанне аб тым, а якія ж мінусы ёсць у гэтай прафесіі, Ірына Валер'еўна надоўга задумваецца.

— Па праўдзе гаворачы, нічога не прыходзіць у галаву. Хоць, — яе позірк падае на фотаздымак, які стаіць на стале, — адзін вельмі істотны недахоп усё ж ёсць. Вельмі мала часу застаецца на сям'ю.

А яна ў дырэктара немаленькая, ва ўсіх складаных жыццёвых сітуацыях у яе ёсць 4 абаронцы: муж і тры сыны. Два старэйшыя ўжо вучацца ў ВНУ, маміна ўцеха — малодшы Ілюша, які цяпер у 4-м класе гімназіі. Часам ён забягае да мамы ў кабінет, каб падзяліцца навінамі ці проста пабыць побач, бо дома яна будзе толькі позна ўвечары.

— Спрабую падумаць, як апісаць мой працоўны дзень, і ў мяне не атрымліваецца. Кожны раз ён розны, як у калейдаскопе, не бывае не тое што аднолькавых, але нават і падобных. І мне вельмі падабаецца такі рытм, не хачу спыняцца!

**Віншуем Ірыну Валер'еўну і ўсіх яе калег з Днём настаўніка. Жадаем плёну, таленавітых вучняў і душэўнага ўздыму. Дзякуй вам за вашу працу!**

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Двор гімназіі ўпрыгожваюць кветкі. Сабраць іх насенне, каб вясной зноў застрахацелі клумбы — клопат тэхсупрацоўніц. Гэты момант таксама не застаецца па-за ўвагай Ірыны ДАНЯНКОВАЙ.**

**Разам з дзяжурным класам Ірына Валер'еўна ў холе сустракае дзяцей, на тварах якіх замест хмурнага соннага выразу адразу ж з'яўляюцца ветлівыя ўсмешкі: гімназісты ведаюць, як трымаць марку.**

## Сувязі

# Адзнака за прыязнасць да беларускай культуры

**Медаль «За вялікі ўклад у літаратуру» Саюза пісьменнікаў Беларусі атрымала казахскі літаратуразнаўца Клара МЫНЖАСАРАВА.**

Узнагароду ў Алматы ўручыў старшы саветнік Пасольства Рэспублікі Беларусь у Казахстане Сяргей Жаргун. Клара Жагіпараўна — вядомы вучоны, прафесар Казахскага жаночага педагагічнага ўніверсітэта. Шмат гадоў загадвае кафедрай рускай мовы і замежнай літаратуры, з'яўляецца дэканам філалагічнага факультэта згаданай ВНУ.

— Клара Мынжасарава шмат робіць па ўшанаванні памяці пісьменніка Адзія Шарыпава, — расказала «Звяздзе» **кандыдат філалагічных навук, добры сябар Беларусі Святлана АНАНЬЕВА.** — З ім яны дружна прайшлі па жыцці доўгія гады як муж і жонка. Адзій Шарыпаў партызаніў у Беларусі. Старонцы, у якую быў улюбёны з ваенных часін, прысвяціў свае празаічныя творы. Часта наведваўся ў краіну-партызанку і ў пасляваенныя гады. Мне прыемна, што з Клара Мынжасаравай сябруюць беларускія дыпламаты, актыўна ўдзельнічаюць ва ўсіх пачынаннях па захаванні памяці пра героя-партызана. Ды і ў Беларусі не адночы ў апошнія гады расказвалася ў друку пра Адзія Шарыпава — пісьменніка, грамадскага і палітычнага дзеяча, вучонага і беларускага партызана.

Медаль жонцы народнага мсціўца ўручалі ў школе, якая носіць імя Адзія Шарыпава. На гэтай жа сустрэчы была прэзентавана і кніга Аслана Жаксылыкава «Сын гор і стэпаў Адзій», у якой не абыдзена ўвагай і беларуская тэма.

**Сяргей Шычко.**

И З В Е Щ Е Н И Е О П Р О В Е Д Е Н И И А У К Ц И О Н А

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**сообщает о проведении торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства**

**ЛОТ №1:** Капитальное строение с инв. № 700/С – 50307 – производственный корпус, расположенный по адресу: г.Могилев, ш. Гомельское, 5, общ. пл. 2393 кв.м, фундамент здания – бутовый, стены – кирпичные, панельные, перекрытия – ж/б, кровля – рулонная совмещенная.
Сведения о земельном участке: в составе земельного участка с кадастровым номером 740100000007004955, расположенного по адресу: г. Могилев, ш. Гомельское, 5, площадью 5,6354 га, предоставленного на праве постоянного пользования, доля в праве 997/1000, назначение – земельный участок для содержания и обслуживания административного здания и других объектов хозяйственного назначения.
**Начальная цена продажи 121 641,30 рубля. Сумма задатка 12 164, 13 рубля**

| | |
|---|---|
| Расчетный счет для перечисления задатка | Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», ЦБУ № 703 г. Минска, МФО 153001369 |
| Дата, время и место проведения аукциона | **Аукцион проводится 09 ноября 2016 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 99, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 08 ноября 2016 года до 15.00 |
| Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества | В течение двух месяцев и двадцати дней с момента подписания протокола аукциона на расчетный счет Организатора аукциона разовым платежом либо траншами |

Для участия в аукционе участник в установленный срок должен представить Организатору:

- заявление на участие в аукционе; - копию платежного документа о перечислении задатка; - паспорт; - индивидуальные предприниматели и юридические лица – резиденты Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; - юридические лица – нерезиденты Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предоставляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

Участник, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в соответствии с Соглашением, которые подлежат уплате в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона.

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: (8-0222) 32-43-98, (8-0291) 400-394; 8-029-624-26-25.**

# ЗЯМЛЯ БАЦЬКОЎ

## Што яднае князя Канстанціна Астрожскага і жыхароў вёскі Тарасава

**Вёска Тарасава, што паблізу сталіцы, стаіць на ажыўленай трасе М6, якая вядзе ў Гродна, Вільнюс. Населены пункт часта называюць варотамі Мінщчыны. На днях на ўездзе ў Тарасава з'явіўся памятны знак у гонар 500-годдзя з дня заснавання. З нагоды юбілею было зладжана свята вёскі, якое сабрала шмат гасцей з усіх куткоў Беларусі. Святкаванне пачалося з хрэснага хода, падчас якога святары, удзельнікі сустракалі абраз Божай Маці «Адзігітрыя». Рэліквія, да якой можа дакрануцца любы ахвотны, будзе знаходзіцца ў мясцовай царкве.**

Упершыню Тарасава ўпамінаецца ў летапісе 1477 года як маёнтак Тарасаўскі Мінскага павета Віленскага ваяводства. На той час тут было ўсяго два-тры двары. У 1516 годзе маёнтак перайшоў ва ўладанне гетмана Вялікага Княства Літоўскага, князя Канстанціна Астрожскага, які шмат зрабіў для яго развіцця. У далейшым справу бацькі працягваў сын Васіль. Тут з'явілася першая драўляная царква Раства Прасвятой Багародзіцы, а гэта давала права перайменаваць маёнтак у сяло. Да нашага часу святыня не захавалася, згарэла. Але частку дакументаў удалося выратаваць. Яны захоўваюцца ў храме Раства Прасвятой Багародзіцы, які ўзведзены 15 гадоў таму, у настаяцеля протаіерэя Сергія Кузьмянкова.

Падчас Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы дзейнічала Тарасава-Ратамскае антыфашысцкае падполле. Да гэтага часу тут жыве партызанская сувязная Яўгенія Максімава. Жанчыне 93 гады. Нягледзячы на сталы ўзрост, яна трымаецца малайцом. На свяце павіншавала ўсіх мясцовых жыхароў і гасцей і прачытала вершы. У Яўгеніі Яфімаўны ўся сям'я змагалася супраць ворагаў. Малодшы брат, сястра, муж, бацька — у партызанскім атрадзе, старэйшы брат-лётчык ваяваў на фронце. У 1943 годзе дзяўчыну схапілі фашысты, пасадзілі ў карцар, па-зверску білі, катавалі. Пазней юную змагарку перавялі ў канцлагер.

**Айцец Сергій задумаў адкрыць царкву для дзяцей. Практычна храм ужо гатовы, засталося ўсталяваць званіцу і аздобіць яго ўнутры.**

— Пасля вайны ў Тарасаве была васьмігодка. Але мястэчка асаблівa не развівалася, і школу закрылі. На сённяшні дзень у вёсцы няма ніякай сацыяльнай інфраструктуры: ні ўстановы адукацыі, ні дзяржаўнага дзіцячага сада, ні фельчарска-акушэрскага пункта, ні паліклінікі, — расказала **старшыня Ждановіцкага сельскага Савета дэпутатаў Ала ДУБКО**. — За ўсімі паслугамі тарасаўцы ездзяць у сталіцу. Але жыццё тут не заціхае. У сучаснай суверэннай Беларусі Тарасава развіваецца. Гэтаму спрыяе блізкасць Мінска, прырода: чыстыя паветра, вада, лес, а таксама інвестыцыі, што ўкладваюцца ў будаўніцтва жылля. На сённяшні дзень у вёсцы афіцыйна зарэгістравана 1992 чалавекі, але пражывае, мяркую, больш як 2 тысячы. Многія мінчане пастаянна жывуць у горадзе, але тут маюць свае жыллё і прыязджаюць адпачыць.

Сёлета ў вёсцы нарадзілася чацвёра малых. Нованароджаных і іх бацькоў на свяце павіншавалі і ўручылі падарункі. У той час, як немаўляты моцна спалі на руках у дарослых, старэйшыя дзеці бавілі час на атракцыёнах, удзельнічалі ў спартыўных спаборніцтвах, з цікавасцю назіралі за рыцарскім турнірам, матчам паміж камандай футбольнага клуба «Іслач» і ветэранамі Тарасава. А ўсім ахвотным гульцы вышэйшай лігі далі майстар-класы і свае аўтографы. Гульні, канцэрты самадзейных калектываў, выстаўка-кірмаш народных умельцаў, фотавыстаўка «Маё любімае Тарасава», конкурсы «Восеньскі букет» і «Самы багаты ўраджай»... Словам, мерапрыемствы былі разлічаны на грамадзян розных узростаў і густаў. Людзі весяліліся, дзяліліся навінамі.



**У сучаснай суверэннай Беларусі Тарасава развіваецца. Гэтаму спрыяе блізкасць Мінска, прырода: чыстыя паветра, вада, лес, а таксама інвестыцыі, што ўкладваюцца ў будаўніцтва жылля.**



Фота БЕЛТА.

— Гэтыя святы аб'ядноўваюць жыхароў. Калі ёсць адна мэта, то для яе дасягнення трэба быць разам. Вяскоўцы разумеюць: гэта месца, дзе яны жывуць, гэта іх малая радзіма. Каб яна была, развівалася, квітнела, патрэбны ўклад кожнага чалавека. І, вядома, такія мерапрыемствы папулярызуюць населены пункт сярод людзей, якія тут пабывалі ўпершыню, — лічыць Ала Уладзіміраўна. — Ведаючы, што да нас прыедуць шматлікія госці, мы звязаліся з Фондам князя Астрожскага ў Польшчы. Збіралася да нас кіраўнік гэтай структуры Ганна Якаўчук, ды, на жаль, захварэла. Але прыехаў польскі творчы калектыў. Яго ўдзельнікі казалі: ім прыемна, што мы ўспамінаем Канстанціна Астрожскага, як родапачынальніка вёскі, помнім сваю гісторыю і падтрымліваем яе.

— Хацелася б, каб мерапрыемствы накшталт гэтага ладзіліся ў кожным населеным пункце. Але тут павінна быць сустрэчнае жаданне саміх жыхароў, — працягвае Ала Дубко. — Можна, канешне, навязваць іх зверху. Але, калі не знаходзіш водгукаў у тых, хто там пражывае, зрабіць гэта дастаткова складана. Напрыклад, падчас святкавання Івана Купалы ў Ратамцы адначасова арганізуецца свята вёскі. У яго падрыхтоўцы прымаюць удзел і дарослыя, і дзеці. Усяго ж на тэрыторыі сельсавета 15 населеных пунктаў. У самай маленькай вёсцы Яркова пражываюць 20 чалавек, у Ждановічах больш як 5 тысяч. Незалежна ад колькасці насельнікаў трэба спрабаваць укараняць традыцыю у кожнай з іх. Людзі сустракаюцца, знаёмяцца паміж сабой, завязваюць сяброўствы, паляпшаюцца суседскія адносіны, усе праблемы паміж сабой суседзі вырашаюць мірам. У выніку ў сельскі Савет дэпутатаў паступае менш скаргаў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

■ Экалагічны лікбез

# На паляванні галоўнае — асцярожнасць

**Восень — пара актыўнага палявання. Ужо адкрыты сезон на птушак, капытных (з засады, з падыходу), бабра і выдру. А з 1 кастрычніка стартуе калектыўнае загоннае паляванне, якое дазваляе паляваць на капытных цэлымі брыгадамі. Таксама з першай суботы кастрычніка паляўнічыя з дыпламаванымі ганчакамі змогуць выйсці на зайца (з хартамі і лоўчымі птушкамі — бяззбройным спосабам).**
**Напярэдадні масавага палявання спецыялісты Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь распрацавалі інфармацыйныя праспекты, якія нагадваюць паляўнічым асноўныя правілы бяспечнага абыходжання са зброяй і правілы вядзення палявання ў цэлым. Улёткі-памяткі будуць размешчаны ва ўсіх паляўнічых гаспадарках, раённых структурах Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў і ў спецыялізаваных крамах.**

## Зброя вымушае да адказнасці

**Валоданне асабістай зброяй накладвае на паляўнічага асаблівую маральна-псіхалагічную адказнасць. Бо зброя — крыніца павышанай небяспекі. Бестурботнасць пры абыходжанні з ёй часцяком прыводзіць да непапраўных наступстваў. Прынцыпы бяспечных паводзін на паляванні адлюстраваны ў главе 12 Правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання. Нагадваем асноўныя з іх.**

Адпраўляючыся на паляванне, варта старанна агледзець і праверыць зброю, выдаліць са ствала (ствалоў) лішняе масла, ліквідаваць магчымыя дэфекты, праверыць надзейнасць дзеяння засцерагальніка. Праверыць усе патроны, пры неабходнасці праверыць іх каліброўку. Не рэкамендуецца выкарыстоўваць патроны са скончаным тэрмінам прыдатнасці і патроны, на металічнай частцы якіх або на паверхні капсуля з'явіліся прыкметы ржы.

## Асноўныя правілы бяспекі

<u>Забараняецца:</u>

- выкарыстоўваць паляўнічую зброю, якая мае тэхнічныя няспраўнасці;
- выкарыстоўваць патроны, якія не адпавядаюць гэтай паляўнічай зброі;
- ажыццяўляць пасадку ў транспартны сродак і высадку з яго з зараджанай паляўнічай зброяй;
- даставаць сабраную паляўнічую зброю за ствол (стволы) з лодкі, воза, санак або іншага транспартнага сродку;
- праводзіць стральбу на шум, шоргат, па незразумела бачнай цэлі, у тумане, у моцны снегапад, у прыцемках, супраць сонца і пры іншых умовах дрэннай бачнасці, а таксама па птушцы, якая ўзлятае ніжэй, чым на 2,5 метра ва ўмовах абмежаванай бачнасці;
- праводзіць стральбу і знаходзіцца з зараджанай паляўнічай зброяй на адлегласці менш за 200 метраў ад крайняга будынка населенага пункта;
- праводзіць стральбу ў напрамку людзей, населеных пунктаў, сельскагаспадарчых жывёл, транспартных сродкаў з агнястрэльнай гладкаствольнай паляўнічай зброі — на адлегласці менш за 500 метраў да іх і з агнястрэльнай паляўнічай зброі з наразным ствалом — менш 2 кіламетраў;
- накіроўваць паляўнічую зброю, у тым ліку незараджаную, на чалавека, свойскіх жывёл або месца іх размяшчэння;
- без неабходнасці праводзіць стрэл, узводзіць курок знешнекурковай зброі або здымаць з засцерагальніка ўнутрыкурковую зброю;



- праводзіць стральбу з лодкі цераз весляроў або іншых паляўнічых, якія знаходзяцца ў лодцы;
- дабіваць прыкладам зброі параненую паляўнічую жывёлу.

<u>Паляўнічая стральба павінна быць разраджана пры:</u>

- пераадоленні на паляванні розных перашкод (канаў, платоў, бураломаў і іншых), пераходзе па кладках цераз рэчкі, ручаі;
- пераездзе з аднаго загона ў іншы, перад пасадкай у транспартны сродак;
- падыходзе да месца прывалу і збору;
- сустрэчы са службовымі асобамі органаў паляўнічага кантролю, унутраных спраў, а таксама службовымі асобамі карыстальніка паляўнічых угоддзяў, якія ажыццяўляюць ахову паляўнічых жывёл у паляўнічых угоддзях.

Паляўнічы можа праводзіць стральбу, толькі папярэдне пераканаўшыся ў тым, што ў напрамку стрэлу няма людзей або свойскіх сельскагаспадарчых жывёл!

## Няпростая камбінацыя

**Ці можа выкарыстоўвацца камбінаваная зброя пры паляванні на ненарміруемыя віды? Ці з'яўляецца законным знаходжанне з ёй ва ўгоддзях пры наяўнасці паляўнічай пуцёўкі на здабычу пушных або птушак? Гэтыя пытанні даволі часта задаюць паляўнічыя, звяртаючыся па тлумачэнні ў Дзяржінспекцыю.**

Спецыялісты звяртаюць увагу, што па сваіх канструктыўных асаблівасцях камбінаваная паляўнічая зброя з'яўляецца адначасова і гладкаствольнай, і наразной. А спосабы і перыяды палявання рэгламентуюцца дадаткам 2 да Правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання і пры неабходнасці паляўнічай пуцёўкай.

Згодна з дадаткам 2, наразная зброя можа быць выкарыстана пры паляванні толькі на некаторыя ненарміруемыя віды паляўнічых жывёл: ваверку, лясную і каменную куніцу, амерыканскую норку, андатру, лясного тхара, ваўка, лісіцу, янотападобнага сабаку, баклана і шэрую чаплю. Пры гэтым характарыстыкі наразнога ствала (стваллоў) камбінаванай паляўнічай зброі — дульная энергія кулі або калібр — павінны адпавядаць названым у дадатку.

Ва ўсіх астатніх выпадках забараняецца нашэнне і (або) выкарыстанне ў паляўнічых угоддзях пры правядзенні палявання на жывёл ненарміруемых відаў зброі з наразным ствалом (стваламі), у тым ліку камбінаванай.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# А ІДЗІЦЕ ВЫ... ДА МЕДЫЯТАРА

## Перш чым судзіцца, трэба навучыцца размаўляць па-даросламу

**Чатыры гадзіны спатрэбілася медыятару, каб скончыць судовую справу, якая доўжылася паміж дзвюма пенсіянеркамі 4 гады і налічвала 6 тамоў дакументаў. Спрэчка жанчын тычылася выдзялення частак у доме і прызнання несапраўдным акта аб дзяржрэгістрацыі зямельнага ўчастка. А дамовіліся яны... да зносу агароджы і высечкі кустоў. З гэтага выпадку, можна сказаць, і нарадзілася ў нашай краіне такая плынь, як медыяцыя — бессудовае вырашэнне канфлікту, і на практыцы было даказана, што гэта працуе.**

### ДАКУМЕНТ З ПЯЧАТКАЙ ЦІ МЕДЫЯТЫЎНАЕ ПАГАДНЕННЕ?

Доўгі час па справядлівасць грамадзяне звярталіся ў суд, аднак прынятыя рашэнні часта не задавальнялі нават выйграўшы бок. Каб людзі маглі цывілізавана вырашаць канфлікты, у 2013 годзе ў Беларусі быў прыняты закон аб медыяцыі. Цяпер у краіне працуюць тры цэнтры, якія рыхтуюць медыятараў. Яны павінны дапамагчы грамадству перайсці да мірнага ўрэгулявання канфліктаў, таму развіццё медыяцыі — важная неабходнасць для дзяржавы, адзначыла **Алена ШАЎЧОНАК, кансультант упраўлення адвакатуры і ліцэнзавання юрыдычнай дзейнасці Міністэрства юстыцыі Беларусі.**



Ва ўсім свеце медыяцыя — дасудовы або пазасудовы працэс. Аднак, каб прыжыцца ў грамадстве, ён укараняецца праз судовую сістэму або праз змяненне нормаў заканадаўства. Спецыялісты Цэнтра медыяцыі і перагавораў ужо выпрацавалі шэраг прапаноў па змяненні некаторых нарматыўна-прававых актаў і прапісалі канкрэтныя катэгорыі асоб, справы якіх будуць прымацца ў судзе толькі пасля таго, як канфліктуючыя бакі пройдуць медыяцыю.

**Каб папулярызаваць магчымасці медыяцыі, суды актыўна прапануюць канфліктуючым найперш папрацаваць з медыятарамі. На сайце Міністэрства юстыцыі створаны спецыяльны раздзел пра медыяцыю, дзе можна даведацца, што гэта за працэдура, знайсці спіс медыятараў з іх кантактамі і адрасы адпаведных арганізацый. У хуткім часе інфармацыя пра медыяцыю з'явіцца ў роліках з сацыяльнай рэкламай і білбордах.**

*— На жаль, беларусы пакуль не вельмі ахвотна звяртаюцца да медыятараў, бо не ведаюць пра гэтую працэдуру. У дадатак існуе непераадольны разрыў паміж статусам медыяцыйнага пагаднення і рашэннем суда з пячаткай. Людзі прывыклі, што ёсць пячатка — значыць, яны абароненыя,* — дадала спецыяліст міністэрства.

Несумненны плюс медыяцыі — поўная канфідэнцыяльнасць. Уся інфармацыя застаецца ў медыятара. У медыяцыі няма прайграўшых і выйграўшых бакоў, бо пагадненне дасягаецца на добраахвотнай аснове і пры ўзаемнай згодзе. Калі людзі самі прымаюць рашэнне, чаго яны хочуць, то добраахвотна выконваюць яго. Па статыстыцы да 90% медыяцыйных пагадненняў былі выкананы.

### ХАЙ МЯНЕ НАВУЧАЦЬ

Медыятарам можа стаць любая асоба з вышэйшай адукацыяй, аднак практыкі і трэнеры, якія рыхтуюць медыятараў, укладваюць у гэтае паняцце значна больш і адсочваюць шмат крытэрыяў падчас вучобы і экзаменаў. Па выніках курсаў медыятараў выдаецца даведка, на падставе якой і па заяве выпускніка ў Мінюсце яны атрымліваюць пасведчанне медыятара. Аднак некаторыя выпускнікі не звяртаюцца па пасведчанне, бо разумеюць, што гэта не іх справа.



*— Здараецца, мы самі не выдаём даведку, бо бачым, што пэўныя вучні не гатовыя да практычнай дзейнасці,* — расказала **Кацярына ГАМЗУНОВА, адвакат, медыятар і трэнер Цэнтра медыяцыі і перагавораў.** — *Большасць тых, хто да нас прыходзіць, думаюць, што медыятар — гэта псіхолаг або юрыст. Гэта не так. У нас ёсць блок па рабоце з эмоцыямі, пачуццямі, якія даюць прафесійныя псіхолагі. Блок па структуры канфліктаў, каб разумець, як людзі да гэтага прыходзяць, і шмат іншага. Медыятар — той, хто прафесійна садзейнічае вырашэнню спрэчкі. Мы жартуем, што гэта чалавек, якога не хапае на кухні, калі сужэнцы лаюцца.*

**У сусветнай практыцы кваліфікацыя медыятара вызначаецца не месцам, дзе ён атрымаў адукацыю, а колькасцю праведзеных медыяцый. Каб працаваць без рызыкі для псіхалагічнага здароўя, больш за дзве сустрэчы на тыдні лепш не прызначаць.**

Медыятар не прымае рашэнні — ён пасярэднік, які дапамагае людзям пачуць адзін аднаго. Задача спецыяліста — у прыгожай, зручнай форме, без абраз данесці інфармацыю да канфліктуючых. Бакі прыходзяць да пагаднення, прымальнага для ўсіх, калі пачынаюць разумець інтарэсы адзін аднаго. Часам, аказваецца, што абодва хочуць аднаго і таго ж, толькі па-рознаму фармулююць гэтае жаданне, патлумачыла трэнер.

### ТАННЕЙ, ХУТЧЭЙ І ПА ЎЗАЕМНАСЦІ

Медыяцыя — не камерцыйны від дзейнасці, як і адвакацкая дапамога. Яе мэта — аказанне паслуг. У рамках пілотнага праекта гэтая працэдура была бясплатная. Цяпер работа па аказанні паслуг па медыяцыі ўзнагароджваецца. Па Мінску сістэма аплаты вар'іруецца. Яна можа быць ад 150 да 350 рублёў за сесію (сустрэчу). Складаныя выпадкі патрабуюць некалькіх сустрэч, а па законе медыяцыя можа доўжыцца да паўгода.

*— Мы не хочам, каб медыяцыя была юрыдычнай працэдурай. Каб дапамагчы людзям, трэба прапрацаваць іх эмоцыі, пачуцці, каб бакі пачалі гаварыць па-даросламу. Людзі ў стане канфлікту мысляць як 4-гадовыя дзеці, а з малымі немагчыма дамовіцца,* — адзначыла Кацярына Гамзунова.

Самыя распаўсюджаныя выпадкі, калі лепш пайсці найперш да медыятара, — шлюбна-сямейныя канфлікты, з імі спецыялісты сутыкаюцца часцей за ўсё. Гэта і падзел маёмасці, і ўдзел бацькоў у выхаванні дзяцей (самая цяжкая катэгорыя, бо малых былыя сужэнцы дзеляць нароўні з маёмасцю). Сюды ж адносяцца спажывецкія, працоўныя і карпаратыўныя (паміж партнёрамі) спрэчкі.

*— Ва ўсім свеце ўвогуле не прымаюць заяву на скасаванне шлюбу, пакуль муж з жонкай не прынясуць даведку, што былі ў медыятара. Вось у ЗША, напрыклад, такія патрабаванні па грашах, паперах і тэрмінах да скасавання, што людзі прасцей бягуць да медыятараў, і ім прасцей захаваць шлюб, чым разысціся,* — расказала адвакат. — *Калі б так рабілася і ў нас, упэўнена, шмат сем'яў можна было б захаваць. Каб зацікавіць людзей і расказаць ім, што магчымы іншы варыянт, акрамя суда, нашы выпускнікі дзяжураць у судах і прапануюць свае паслугі. Акрамя таго, з судом Мінскага раёна мы распрацавалі крэатыўныя абвесткі па выкліку ў суд, на звароце якіх напісана інфармацыя з кантактамі цэнтраў медыяцыі.*

Дарэчы, медыяцыя значна таннейшая, чым паслугі адвакатаў і аплата дзяржпошліны. За скасаванне шлюбу плаціцца няшмат, аднак дзяржпошліна за падзел маёмасці складае 5% ад яе рынкавага кошту. Калі суддзя агучвае лічбы, здараецца, бакі сыходзяць дамаўляцца праз медыяцыю.

### АКТЫЎНАЕ СЛУХАННЕ З КАВАЙ ЦІ ВАЛЯР'ЯНКАЙ

Аптымальны час для правядзення медыяцыі, калі ніхто не стамляецца, — 3-4 гадзіны. Але сустракаюцца выпадкі, калі можна сядзець і 8 гадзін, бо ідзе дыялог, які немагчыма перапыніць. Гэта называецца актыўнае слуханне, калі бакам адводзіцца колькі заўгодна часу, каб выказацца. У судзе ж гэта якраз і немагчыма, бо трэба дакладна і хутка сфармуляваць патрабаванні.

Праводзяць медыяцыю два медыятары разам. Для пасляховых перамоў трэба стварыць нейтральныя і зручныя ўмовы.

*— Калі ў судзе ёсць вольны пакой, размаўляюць у ім. Калі ж няма — для медыяцыі звычайна выдзяляюць залу для разгляду спраў, дзе ледзьве не палову памяшкання займае клетка з кратамі. Такая карціна не спрые зручнасці, таму самы ідэальны варыянт — сустрэча ў офісе ці цэнтры медыяцыі. У сябе я магу і гарбатай папаіць, і валяр'янкай. У мяне ўжо ўсё ёсць, зыходзячы з вопыту,* — смяецца медыятар. — *Часцей за ўсё сустракаюся з людзьмі ўвечары ці ў выхадны, бо ім бывае немагчыма вызваліцца ў будні.*

Існуе і такое паняцце, як шатл-медыяцыя. Яна прымяняецца, калі бакі проста фізічна не могуць знаходзіцца побач. Толькі пабачаць адзін аднаго — адразу пачынаецца сварка. Тады медыятары рассаджваюць іх у асобных пакоях і ходзяць паміж імі.

*— У такіх выпадках кожны з канфліктуючых паасобку разважае і мысліць нармальна, гатовы абмяркоўваць варыянты, а разам яны губляюць галаву. Сустракаюцца такія людзі, толькі калі дамоўленасць дасягнута. Аднак здараецца, што нават пасля медыяцыі людзі не ў стане пабачыцца — тады пагадненне яны падпісваюць паасобку,* — акрэсліла Кацярына Гамзунова.

**У Беларусі працуе тры цэнтры медыяцыі, праведзена больш за 250 працэдур медыяцыі, выдадзена 323 пасведчанні медыятара.**

Тым не менш не заўсёды можна дастукацца да людзей. Некаторыя пасля медыяцыі вяртаюцца ў суд і хочуць, каб суддзя прыняў рашэнне, тым самым зняўшы з іх адказнасць. Нярэдка тыя, хто не дамовіўся ў медыятараў, потым у судзе казалі, што гатовыя да пагаднення. А гэта ўжо вынік прапрацаваных са спецыялістам эмоцый.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*



БПС-СБЕРБАНК

**С 03.10.2016** ОАО «БПС-Сбербанк» устанавливает следующий размер процентов по действующим договорам **в долларах США и евро** срочных банковских депозитов «Сохраняй», «Пополняй» и «Управляй»:

| Наименование депозита | Период заключения договоров | Размер процентов (годовых) |
|---|---|---|
| «Сохраняй» | с 05.12.2011 по 31.03.2016 (включительно) | 3% |
| «Пополняй» | | 3% |
| «Управляй» | | 2,4% |

Согласно Условиям депозитов, установленный размер процентов будет применен **с 03.11.2016**.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 28.11.2014 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673. ОАО «БПС-Сбербанк»

**ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в аг. Барсуки, дер. Белая Лужа, дер. Крутая Гора и дер. Глинище Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | **31 октября 2016 года в 15.00**<br>г. Жодино, пер. Молодежный, 3<br>Жодинский сельисполком, кабинет №1 |
| 3 | Продавец и его адрес | Жодинский сельский исполнительный комитет, г. Жодино, пер. Молодежный, 3 |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | **Лот № 1** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881701101000421 в аг. Барсуки, участок № 3<br>**Лот № 2** – земельный участок площадью 0,1305 га с кадастровым номером 624881704101000050 в деревне Глинище, участок № 2<br>**Лот № 3** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881701601000120 в деревне Белая Лужа, ул. Магистральная<br>**Лот № 4** – земельный участок площадью 0,1478 га с кадастровым номером 624881708101000031 в деревне Крутая Гора, участок № 1<br>**Лот № 5 –** земельный участок площадью 0,1497 га с кадастровым номером 624881708101000032 в деревне Крутая Гора, участок № 2<br>**Лот № 6** – земельный участок площадью 0,1499 га с кадастровым номером 624881708101000034 в деревне Крутая Гора, участок № 3<br>**Лот № 7 –** земельный участок площадью 0,1499 га с кадастровым номером 624881708101000033 в деревне Крутая Гора, участок № 4 |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 7 | Начальная цена продажи | **Лот № 1** – 10 000 рублей<br>**Лот № 2** – 5 000 рублей<br>**Лот № 3** – 4 000 рублей<br>**Лот № 4** – 2 500 рублей<br>**Лот № 5** – 2 500 рублей<br>**Лот № 6** – 2 500 рублей<br>**Лот № 7** – 2 500 рублей |
| 8 | Условия проведения аукциона | Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь.<br>Аукцион считается состоявшимся при наличии не менее двух участников |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | Лоты №№ 1, 2<br>(возможность электроснабжения, газоснабжения) |
| 10 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной цены земельного участка, р/с 3641000000263 в филиале №616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, ул. 50 лет Октября, 25«А», код 812, УНП 600023532 (с пометкой «Задаток за земельный аукцион») |
| 11 | Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками | Каждую среду в 15.00 |
| 12 | Окончательный срок приема заявлений | 25 октября 2016 года до 17.00 |
| 13 | Контактный телефон | 8-01775 35-449, 8-01775 37-174, 8-01775 37-189 |

Расходы по организации и проведению аукциона и затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Документ (копию), удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица.
4. Доверенность, заверенную нотариально (в случае, если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).

**ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ**

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | **Лот №1. Автомобиль KIA CLARUS, 1996 года выпуска, цвет: темно-серый перламутр, стоимостью 535 белорусских рублей.**<br>**Лот №2. Автомобиль UAZ 31519 095-2, 2005 года выпуска, цвет: темно-зеленый, стоимостью 545 белорусских рублей.** |
| Собственник (владелец) имущества | ОАО «Ушачский райагросервис» (УНН 300005969) |
| Местонахождение (адрес) имущества | Ушачский р-н, д. Граденец, ул, Центральная, 3а |
| Наличие обременений | нет |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | 31.10.2016 в 11.00<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, д. 10/1, каб. № 1.3 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. Б.Хмельницкого, д. 10/1. (ww.vitebskjust.gov.by)<br>Судебный исполнитель Зиновенко Олег Олегович, тел. (80212) 61-40-22, моб. +375336879159<br>начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (80212) 61-40-15 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет Главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 635, УНП 300002505, **не позднее 15.00 28.10.2016 г.**<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. |

■ На сцэне

# З жыцця насякомых

**Ці то візуалізацыя іранічнай паэзіі, ці то вакальны перформанс, ці то жывы канцэрт, ці то мультыплікаванае дзівацтва. Зрэшты, музычны спектакль «З жыцця насякомых» — гэта ўсё пералічанае адразу. Прэм'ера незалежнага тэатральнага праекта Святланы Бень і Дзмітрыя Багаслаўскага, што адбылася 28 і 29 верасня на сцэне Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, распачала праграму VI Міжнароднага фестывалю «ТЭАРТ». Старт форуму дадзены, і гэта сімпатычны старт.**





Фота Вольгі ПІПЧАНКА.

Пастаноўка «З жыцця насякомых» утрымлівае ў сабе шмат важных і раўнапраўных паміж сабой імёнаў. У піцерскай тусоўцы канца 1920-х — пачатку 1930-х гадоў ОБЭРІУ — Аб'яднанні рэальнага мастацтва — дзейнічаў паэт Мікалай Алейнікаў (паплечнік Данііла Хармса, Мікалая Забалоцкага, Аляксандра Увядзенскага). У сваё знешне прымітыўныя вершы ён хаваў іронію, сарказм і правакацыю. Яны, у тым ліку творы з героямі-насякомымі, сталі асновай, можна сказаць, фундаментам і галоўным акордам спектакля. «З жыцця насякомых» пачынаецца (у пераносным сэнсе) з паэзіі Мікалая Алейнікава і будуецца вакол яе. Чатырнаццаць вершаў, музыкальна, па-акцёрску і візуальна абыграных на сцэне тэатра. Удзельнічаюць у гэтым адзін акцёр — паэтка, спявачка, рэжысёр і лідар гурта «Сярэбранае вяселле» Святлана Бень — і два «тапёра» — Дар'я Мароз за раялем і Марыя Васілеўская са скрыпкай і тэрменвоксам. Суражысёрам Святланы Бень, якая, апроч іншага, з'яўляецца акцёрам і вакалістам спектакля (і, можа, кім яшчэ), стаў Дзмітрый Багаслаўскі.

Недарэмна я ўспомніла тапёраў — музыка Валерыя Воранава і дыспазіцыя «сіл» на сцэне нагадала дарэвалюцыйнае нямое расійскае кіно, па асацыяцыі нават з'явілася асаблівае прадчуванне, якое, зрэшты, не спраўдзілася, хоць няўлоўнае адценне архаічнасці ў спектаклі ўсё ж прысутнічае.

«З жыцця насякомых» — гэта вялікае, па ўсёй даўжыні сцэны, палатно-экран; гэта два музыканты ў правым баку — як ужо казалася, выканаўцы на раялі, скрыпцы і тэрменвоксе; гэта акцёрка і вакалістка ў адной асобе, якая спявае ўсе чатырнаццаць вершаў Мікалая Алейнікава і спрытна карыстаецца спецыяльна для пастаноўкі сканструяваным табурэтам (і іншымі рэчамі, але не такімі пастаяннымі). Чатырнаццаць вершаў, чатырнаццаць частак, чатырнаццаць пазіцый на табурэце.

Спектакль, пабудаваны на паэзіі, спрабуе адлюстраваць свет і бачанне яе аўтара. Калі ў вершах Алейнікава хаваюцца тайныя сэнсы, у спектаклі, вядома ж, іх таксама варта шукаць. Але не толькі: пастаноўка «З жыцця насякомых» апроч паэтычных падтэкстаў стала вельмі цікавым і своеасаблівым відовішчам, да якога, праўда, трэба прызвычаіцца цягам першых хвілін. Дарэчы, першыя хвіліны — гэта цемра, нерухомасць і гукі стракату і калупання насякомых. Калі ты ўжо пачынаеш успамінаць, якая працягласць спектакля анансавалася, і думаеш, ці не прыйдзецца за гэты час звар'яцець ад аглушальнага корпання жукоў, дзейства пачынаецца.

Гэта дзейства, здаецца, апроч агульнага стылю не мае драматургічнай лагічнай звязкі паміж часткамі — «маленькімі трагедыямі», як было названа ў анатацыі. Затое яно ўтрымлівае зайздросную — у разумных памерах — разнастайнасць, рэдкую для такога кароткага тэрміну і адной сцэны. З абсурднымі вершамі Алейнікава добра карэлюецца манера выканання (толькі ўсплёскаў, усплёскаў не хапае!) і асаблівы стыль анімацыйнай часткі. Ды і што казаць — усё тут адно з адным выдатна спалучаецца.

Напэўна, не ў апошнюю чаргу гэты спектакль і яго незвычайная, але прываблівая форма патрэбны тым, хто забыўся пра існаванне Алейнікава і ўвогуле гурта ОБЭРІУ. Але як ужо казалася, імёны, што маюць дачыненне да пастаноўкі, раўнапраўныя. Асобныя пачуцці і асацыяцыі выклікае музыка, прыемную замілаванасць і смех — вуглаватая ігра Святланы Бень, вядома ж, спектакль не адбыўся б без анімацыйнай часткі, што праецыруецца на экран, усталяваны на сцэне фонам, і ўдзельнічае ў дзеянні. Мультымедыя-мастаком стала Марыя Пучкова.

Вочы мухі, шапка-жук, доўгія рукі «Вівісектара» працягваюць стыль прымітывізму, за якім дакладна ёсць нешта большае.

Пастаноўка спектакля «З жыцця насякомых», па словах стваральнікаў, шмат у чым стала магчымай дзякуючы альтруізму неабыякавых людзей (і раяль, што стаіць на сцэне, прадастаўлены магазінам у арэнду бясплатна), што ўвогуле ў сферы культуры сёння не выключэнне, а звычайная рэч. Тады да раўнапраўных імёнаў, удзельнікаў стварэння «З жыцця насякомых», трэба дадаць і альтруізм.

Добры пачатак, якім пастаноўка стала для «ТЭАРТу», — палова справы. Тэатральны форум у гэтым годзе паказвае 23 пастаноўкі з 9 краін.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■ Кінакрокі

# ФЕСТЫВАЛЬ НА КАНАПЕ

## Фільмы беларускіх аўтараў можна будзе паглядзець у любой кропцы краіны

**Усё вельмі проста — каб прычыніцца да новага фестывалю беларускага дакументальнага кіно BELARUSDOCS, трэба толькі ў адпаведны тэрмін, лепш не выходзячы з дому, адкрыць інтэрнэт-старонку і атрымаць доступ да адной з найвыдатнейшых айчынных дакументалак апошняга часу. Такім чынам падчас анлайн-фестывалю можна паглядзець ці перагледзець сем карцін, ужо адзначаных замежнымі гледачамі і міжнароднымі фестывалямі. Гэта праграма — фільмы пра нас, пра краіну, пра тое, што мае да нашага жыцця дачыненне, — дэманструе дасягненні беларускіх аўтараў, з лепшага боку адкрывае айчынны кінематограф і, канешне ж, зацікаўлівае блізкасцю інтарэсаў.**





«Скрыжаванне» Настассі Мірашнічэнкі.

Да большасці беларускіх дакументальных фільмаў, створаных у апошнія гады, няма вольнага доступу, нешта можна знайсці ў тэлеверсіі, што само па сабе азначае пэўнае скажэнне аўтарскага варыянту, некаторыя зрэдку дэманструюцца ў невялікіх залах. Анлайн-фестываль — зручны фармат. Ён не прадугледжвае спецыяльнай пляцоўкі (дзе глядзець кіно — воля ваша), пэўнага рытуалу дачынення да мастацтва, выхаду ў свет. Толькі адкрыццё, прызначанае на 3 кастрычніка ў Галерэі TUT.BY, адбудзецца ў афлайн-фармаце. Кожная з сямі стужак праграмы BELARUSDOCS будзе доступна на працягу сутак.

«Ідэя анлайн-фестывалю напрошвалася сама сабой: добрыя аўтарскія фільмы з нацыянальным каларытам (на многія з якіх былі выдаткаваны дзяржаўныя сродкі) аказаліся нікому не патрэбнымі. Хоць за мяжой карціны з праграмы паказваліся на дзясятках фестываляў, дзе збіралі поўныя залы, у Беларусі ж добра, калі дэманстраваліся аднойчы — у Нацыянальным конкурсе кінафестывалю «Лістапад». У рэгіёнах гэтыя фільмы не бачылі зусім, — каментуе **каардынатар фестывалю Алесь ЛАПО**. — Праграма фарміравалася найперш з тых фільмаў, якія былі заўважаны на кінафорумах. Хацелася таксама паказаць разнастайнасць, розныя генерацыі аўтараў. Апошняе атрымалася напалову. Фільмы маладых рэжысёраў, якія хацелася бачыць у праграме, — «Шэпты і крыкі Тані Б.» Сяргея Каласоўскага, «Пра каханне» Любы Зямцовай, «Паміж небам і зямлёй» Дзімы Дзядка — у яе не трапілі, бо адмаўляліся героі ці самі аўтары. Яны б узбагацілі фестываль, бо стылёва і тэматычна з яго выбіваюцца».

> **«Ідэя анлайн-фестывалю напрошвалася сама сабой: добрыя аўтарскія фільмы з нацыянальным густам (на многія з якіх былі выдаткаваны дзяржаўныя сродкі) аказаліся нікому не патрэбнымі».**

Праграма складаецца з работ Нацыянальнай кінастудыі і незалежных аўтараў. Напрыклад, «Мяжа Нарвілішак» Дзмітрыя Махамета знятая на «Беларусьфільме». Гэта паэтычны сузіральны аповед пра беларускую вёску Нарвілішкі, што пасля тэрытарыяльнага перадзелу 1939 года аказалася ў складзе Літвы. Сёння паселішча адносіцца да прадстаўнічага слова «Еўрасаюз», але на вуліцах гучыць беларуская мова, жыхары ўключаюць беларускія тэлеканалы, мараць пра пункт пропуску, каб скараціць шлях да сваякоў у беларускую вёску Пецкуны. Пакуль да хаты, што знаходзіцца за 400 метраў, трэба ехаць трыста кіламетраў.

Тытулаванае «Скрыжаванне» Настассі Мірашнічэнкі — не проста мастацкі твор, але і сацыяльны праект. Карціна пра бяздомнага сінявокага мастака Валерыя Ляшкевіча, што зафіксавала яго работу, сціплы быт, успаміны і разважанні, у выніку паўплывала на адкрыццё выставы героя ў Нацыянальным мастацкім музеі. На адмысловым банкаўскім рахунку быў адкрыты збор сродкаў на ўласны дом. У гэты момант Валерый Ляшкевіч разам з валанцёрамі шукаюць прыдатнае жыллё. «Скрыжаванне» паказала дні мастака ў кожную пару года — ад зімы да зімы, даследчая цікаўнасць дакументаліста намякнула на цыклічнасць, нязменнасць часоў (за кошт паралельных эпізодаў) і ўсё ж такі імклівасць жыцця.

Фільм «Госці» Андрэя Куціла расказвае пра недзяржаўны прытулак для тых, каму няма куды ісці, і пра яго стваральніка Аляксея Шчадрова, альбо, як ён сябе называе, брата Луіджы. Некалі Аляксей Шчадроў, фельчар хуткай дапамогі, трапіў за краты за продаж наркатычных рэчываў, а пасля вызвалення і некалькіх гадоў блукання вырашыў дапамагаць тым, хто аказаўся ў сітуацыі, у якой ён сам апынуўся пасля турмы — у стане закінутасці і сацыяльнай абыякавасці.

Праграма дакументальнага кіно, канешне, не магла абысціся без Віктара Аслюка — яго карціна «Алмаз», знятая на «Беларусьфільме», адкрые BELARUSDOCS. Алмаз — гэта конь, адзіны сябар Аляксея Клюні, што ў адзіноце жыве на Ладажскім возеры і марыць памерці першым, каб вазок з яго труной вёз Алмаз.

Яшчэ адна карціна пра мастака — работа Вольгі Дашук «Не адзін», героем яе стаў Віктар Залацілін. У свае сорак гадоў яе вырашыў пераехаць з горада ў вясковы бацькоўскі дом. Адзінота на беразе Нёмана — жыццесцвярджальны фільм пра самадастатковага творцу, які пераадолеў фізічную асаблівасць свайго цела.

Нарэшце, сімвалічны «Дудар» Юрыя Цімафеева, незалежная чорна-белая карціна «Пасха Хрыстова» Дар'і Юркевіч — і праграма BELARUSDOCS у поўным складзе. Фільмы, пачынаючы з 4 кастрычніка, можна паглядзець на старонцы afisha.tut.by/belarusdocs, якая будзе аднаўляцца кожны дзень.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■ Фестывалім

# 110 МУЗЕЯЎ ПАД АДНЫМ ДАХАМ

**Сёння ў Магілёўскім спартыўным комплексе «Алімпіец» урачыста адкрываецца III Нацыянальны форум «Музеі Беларусі», які праходзіць пад знакам «Музей у новай крэатыўнай эканоміцы».**

На вялікай спартыўнай пляцоўцы на працягу двух дзён будуць прэзентаваць сябе звыш 110 дзяржаўных, ведамасных, школьных музеяў і кампаній, якія працуюць у музейным бізнесе. Прывітальнае слова ўдзельнікам форуму накіраваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Наведвальнікаў чакае знаёмства з новымі культурна-адукацыйнымі і асветніцкімі праектамі. У Магілёў прыязджаюць эксперты з Расіі, Украіны, Польшчы, Швецыі. На пасаду старшыні аргкамітэта запрошана генеральны дырэктар Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі Зельфіра Трэгулава. Запланавана вялікая дзелавая праграма, падчас якой беларускія музейшчыкі змогуць знайсці для сябе шмат новага і карыснага.

Дадатковымі пляцоўкамі свята стануць музей гісторыі Магілёва і абласны мастацкі музей імя П. Масленікава. У выставачнай зале па вуліцы Болдзіна адбудзецца прэзентацыя кнігі пра Спірыдона Собаля і магілёўскае кнігадрукаванне XVII—XVIII стагоддзяў. Падчас экскурсіі «Музейнае кальцо Магілёва» будзе магчымасць наведаць абласны краязнаўчы музей імя Е. Раманава, музей этнаграфіі, зал алімпійскай славы, музей МНС, кафедральны касцёл, Мікалаеўскую царкву. Самыя дапытлівыя і актыўныя аматары гісторыі і мастацтва змогуць паспрабаваць шчасця ў займальнай квэст-гульні «Шукаем музейны прадмет».

Свята будзе суправаджацца выставай-продажам вырабаў народных майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і гандлем прадпрыемстваў грамадскага харчавання каля спартыўнага комплексу «Алімпіец».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Кантрамарка

# «Белая Вежа»: тэатр ідэй і тэатр людзей

**Некалькі гадоў таму на адным з тэатральных абмеркаванняў расійскі рэжысёр Ілья Ротэнберг паспрабаваў падвесці выніковую рысу пад дыскусіяй: «Проста ёсць тэатр людзей і ёсць тэатр ідэй». Доўгі час я круціла ў галаве гэтыя словы, спрабуючы знайсці кропку, спектакль, дзе б гэтыя дзве з'явы спалучыліся і спалучэнне было б гарманічным. Я знайшла.**



Фота Вадзіма ЯКУБЁНКА.

Мае сябры, не заядлыя тэатралы, часам дапытваюцца: «Ну, а калі б ты выбірала толькі адзін спектакль на фестывалі, што б ты пайшла глядзець?» Мне падабаецца крытэрый, і часам пасля фестывалю я пытаюся пра тое ж сама сябе. Што б я паглядзела, калі б магла пабачыць толькі адзін спектакль брэсцкай «Белай Вежы-2016»? «Язычнікі». Чаму? Бо гэта тэатр ідэй і тэатр людзей адначасова.

П'еса «Язычнікі» ўкраінскага драматурга Ганны Яблонскай цяпер непадзельна звязана з лёсам аўтара. Ганна напісала гісторыю пра веру і бязвер'е, пра цуд, на які мае спадзеў кожны. Атрымала прэстыжную прэмію часопіса «Искусство кино». Ляцела ў Маскву на ўручэнне і загінула падчас тэракта ў маскоўскім аэрапорце Дамадзедава 24 студзеня 2011 года...

«Язычнікі» — гэта сямейная драма. Сям'я Алега і Марыны перажывае крызіс: жыццё разам па інерцыі, матэрыяльныя цяжкасці. Іх дачка Хрысціна — асабістую драму: кахае выкладчыка. Але аднойчы на парозе кватэры з'яўляецца маці Алега Наталля, якая апошнія гады жыла пры манастыры. Уцаркоўлішы сям'ю, яна, здаецца, змяняе сітуацыю да лепшага, ды аднаго дня Хрысціна выходзіць дафарбаваць балкон і робіць крок уніз... але застаецца жывой.

Гісторыя пра тое, у што мы верым, а ў што не, зачапіла мэтра літоўскай рэжысуры Ёнаса Вайткуса. Ён звярнуўся да яе двойчы. Першы раз Вайткус паставіў «Язычнікаў» у Рускім драматычным тэатры Літвы, другі — у Дзяржаўным акадэмічным рускім тэатры драмы імя М. Горкага ў Астане (Казахстан). Большасць тых, хто бачыў абодва варыянты, аддаюць перавагу казахстанскі.

На камерный сцэне, у чорным кабінеце — шэраг крэслаў. Побач некалькі прадметаў — сімвалаў веры: флейта, чырвонае яйка, паганская маска. Акцёры сядаюць плячом да пляча і з заплюшчанымі вачыма пачынаюць прамаўляць дыялогі. Занятых у сцэне падсвечвае прамень пражэктара, і часам складваецца ўражанне, што тэкст нібыта сыходзіць на чалавека разам са святлом. Акцёр транслюе нейкую гісторыю з чужога жыцця, паралельнага свету. Гэты прыём ляжыць у аснове рэжысёрскага рашэння. Героі п'есы расплюшчваюць вочы толькі ў момант рытуальнага танца ды ў фінале спектакля. Але відавочная статыка раптам выяўляе здольнасць да шматузроўневай метафарычнасці і пераасэнсавання ключавых паняццяў тэатральнага мастацтва. Так Вайткус змяняе звыклы пункт гледжання на сцэнічнае дзеянне і вывучае яго статычныя магчымасці. Акцёры, пазбаўленыя асноўных сродкаў выразнасці (пластыкі, позірку), вымушаны шукаць іншыя, канцэнтруючыся на галасавым увасабленні. Рэжысёр не імкнецца разняць тэкст на складнікі і паказаць нам маўленне, як такое, як выставачны аб'ект. Не, захаваць сэнс прамаўляемага для рэжысёра з'яўляецца прыярытэтнай задачай. Выбар такога спосабу існавання нібы падкрэслівае візуальна нашую духоўную слепату ў дачыненні да іншага, таго, хто побач. З гэтай слепаты і пачынаецца драма герояў. І гэтай слепаты, адчуўшы адно аднаго (акцёры не могуць паглядзець на партнёра, а могуць толькі чуць яго голас, прыслухоўвацца да дыхання і дробных рухаў побач), героі ўсяляк імкнуцца пазбавіцца і пазбаўляюцца ў фінале. Люструючы адчуванне ў глядзельную залу, дзе роўна гэтак жа, плячо да пляча, сядзяць гледачы.

Фінал п'есы абнадзейвае: «Я не сумняваюся, што ён [Бог] ёсць», — сцвярджае ў канцы свайго маналога Марына (Аксана Байко), гледзячы ў залу. Аднак мы гэта сцвярджэнне ўспрымаем у кантэксце рэжысёрскай звышідэі: не важна, у што ты верыш... Праваслаўная Наталля (Наталля Матвеева) спрабуе выгнаць бесаў з унучкі. Унучка Хрысціна (Паліна Харламава) сцвярджае, што яна — агностык, і адназначнага адказу на пытанне «Ці існуе Бог?» даць не можа. Боцман (Раман Чэхандскі) верыць у духаў загадкавай маскі, якую ён прывёз з Афрыкі. Алег (Яўген Карачараў) — у творчасць і музыку, якой ён не мае магчымасці заняцца. Дык вось, не важна, у што ты верыш, важна заўважыць і паспрабаваць зразумець чалавека побач. Сэнс падлеткавага ліста Хрысціны да каханага нечакана паглыбляецца: «Свет, дзе ты, і свет без цябе — гэта два розныя светы. І калі мне нельга жыць у першым, я адмаўляюся жыць у апошнім...». А Ёнас Вайткус выяўляе, што тэатр людзей і тэатр ідэй можна злучыць у адной кропцы.

**Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ**

■ Зямное і ўзвышанае

# МІНСК — ВАТЫКАН: АБРЫСЫ ДУХОЎНАСЦІ

## «Акном» у боскае вымярэнне стала выстаўка ікон і прадметаў літургіі XVII—XXI стагоддзяў «Свет нябесны на зямлі»

**Гэтая экспазіцыя адкрылася ў Нацыянальным мастацкім музеі.**

З аднаго боку, музей — установа свецкая і дзяржаўная, якая павінна захоўваць сведчанні часу і расказваць пра іх сучаснікам і наступнікам. Але, бывае, здараецца так, што свецкае і рэлігійнае вымярэнні перакрыжоўваюцца, злучаюцца ў лагічным сімбіёзе, дапаўняюць адно аднаго. Так, па словах **міністра культуры Барыса СВЯТЛОВА,** адкрыццё выстаўкі праваслаўных, каталіцкіх і ўніяцкіх абразоў і алтарных карцін з мерапрыемства чыста свецкага стала імпрэзай, пранізанай высокімі хрысціянскімі каштоўнасцямі.

— Сіла гэтай экспазіцыі не толькі ў тым, што яна паказвае творы, якія жывуць ці набылі другое жыццё, але дазваляе паназіраць за работай рэстаўратараў у працэсе вяртання каштоўнасцяў да жыцця, — падкрэсліў міністр.

Думку міністра падтрымаў і **Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі ПАВЕЛ.**

— Гэтая выстаўка сёння вельмі важная, — зазначыў Уладыка. — Тут можам пабачыць каштоўнасці, якія раней былі пад забаронай і нават знішчаліся, разбураліся, былі забытыя. Гэта наша духоўная спадчына, спадчына культуры нашага народа. У іконах, прадстаўленых на экспазіцыі, — сутнасць духоўнага жыцця людзей розных эпох. Мы зусім невыпадкова захапляемся гэтымі работамі, бо яны — погляд чалавека на свет боскага, «акно» ў боскае, сакральнае.



Падчас выстаўкі Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі ПАВЕЛ *(справа)* і Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі, архіепіскап Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ.

Абразы «Спас Уседзяржыцель» і «Маці Божая з дзіцем» 1670-х гадоў з Мікалаеўскай царквы, што ў Пінску, захавалі традыцыйную візантыйскую іканаграфію, а комплекс жывапісных твораў каталіцкага кляштара святой Брыгіты, што ў Гродне, які датуецца сярэдзінай XVII стагоддзя, дэманструе ўплыў еўрапейскай мастацкай культуры. Сакральныя творы, прадстаўленыя на экспазіцыі, даюць магчымасць назіраць за фарміраваннем беларускай мастацкай традыцыі, што ўвабрала характэрныя рысы культур хрысціянства Захаду і Усходу. На выстаўцы ў мастацкім музеі прадстаўлена большая частка абразоў, што экспанаваліся сёлета ў Музеях Ватыкана, у сусветнай сталіцы каталіцызму, расказвалі пра адметнасці беларускага сакральнага мастацтва. Дарэчы, тая выстаўка стала значнай падзеяй для культурнага жыцця Ватыкана і ўпершыню так шырока прадставіла ў Італіі беларускае мастацтва.

— Музеі Ватыкана штодзень наведваюць тысячы турыстаў, — расказаў **Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі, архіепіскап Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ.** — Госці Ватыкана прыходзяць паглядзець на багацці, што там захоўваюцца. І сярод гэтых багаццяў знайшлося месца для нашай краіны, для праваслаўных, каталіцкіх абразоў і ікон. Адкрыццё выстаўкі ў Ватыкане стала вялікай падзеяй, якую не абышоў сваёй увагай і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка пасля сустрэчы з Папам Рымскім Францішкам. Я добра памятаю дзень 18 мая. У Музеях Ватыкана штодзень нешта адбываецца, але колькасць людзей, якія прыйшлі на адкрыццё беларускай выстаўкі, здзіўляла. Таксама ўсіх здзіўляла тое, што ў межах экспазіцыі прадстаўленыя і каталіцкія, і праваслаўныя абразы. Гэта значыць, што Беларусь дыхае двума лёгкімі — заходняга і ўсходняга хрысціянства.



Фота Касцуся ДРОБАВА.

Выстаўка беларускіх ікон у Ватыкане стала вельмі паспяховай. Нягледзячы на тое, што экспазіцыя атрымалася больш сціплай, не такой разнастайнай, як планавалася адпачатку, яна выклікала вялікую ўвагу грамадскасці. Сведчанне таму — цалкам запоўненая кніга водгукаў, дзе ёсць запісы на розных мовах. Нават па-беларуску. Гэта захопленыя водгукі саміх беларусаў. Цікава, што на адкрыццё экспазіцыі ў Мінску завітаў **загадчык аддзела візантыйскага і сярэдняевечнага мастацтва Музеяў Ватыкана Гвідa КАРНІНІ.**

— Было некалькі прычын на тое, каб беларуская выстаўка стала значнай падзеяй у Ватыкане, — падкрэсліў ён. — Па-першае, беларускае мастацтва не так добра знаёмае італьянскай публіцы, таму задумка паказаць нешта новае — заўсёды выйгрышная карта. Па-другое, беларускае мастацтва, дзякуючы геаграфічнаму становішчу краіны, паказвае спалучэнне рысаў усходу і захаду. Гэта як лабараторыя для мастацтвазнаўцы, што дазваляе прасачыць, як розныя традыцыі і культуры суіснуюць, спалучаюцца. І па-трэцяе, беларускае мастацтва — прыклад суіснавання розных вераў, ці, калі хочаце, розных спосабаў верыць у адно і тое ж.

І сапраўды, наша сакральнае мастацтва — прыклад гарманічнага суіснавання заходняга і ўсходняга хрысціянства, а экспазіцыі, што аб'ядноўваюць рэлігійныя прадметы розных канфесій, яшчэ раз даказваюць павагу беларусаў да веры, духоўнасці, боскасці незалежна ад канфесійнай прыналежнасці. Яшчэ адным сімвалам гарманічнага, мірнага суіснавання канфесій на Беларусі можна лічыць і новы канверт з маркай, прадстаўлены Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі. На ім — два абразы побач — праваслаўны і каталіцкі. Сімвалічна, што падчас адкрыцця выстаўкі «Свет нябесны на зямлі» прайшла і ўрачыстая цырымонія гашэння новага канверта з маркай.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

■ Падзея

# МІНУЛЫЯ АСВЕТНІКІ — БУДУЧЫМ

## У педагагічным універсітэце адкрылі мастацкую галерэю

**Пакуль яе калекцыя складаецца з сямі твораў, якія, вядома ж, маюць прамое дачыненне да таго, чаму ў гэтым універсітэце вучаць. Для студэнтаў адкрытая выстаўка стала чарговым напамінам, што ў будучыні яны, як педагогі, будуць перадаваць высокія ідэі і добрыя памкненні падобна тым, хто ў беларускай гісторыі вядомы як асветнік. Як Еўфрасіння Полацкая, Мікола Гусоўскі, Кірыла Тураўскі, Францыск Скарына, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Сімяон Полацкі. Новая галерэя адкрылася 30 верасня ў будынку Беларускага дзяржаўнага педуніверсітэта імя Максіма Танка з сямю партрэтамі згаданых асоб і пад назвай «Асветнікі зямлі беларускай».**

Аўтарамі работ сталі выкладчыкі факультэта эстэтычнага выхавання Георгій Лойка (куратар стварэння серыі партрэтаў), Мікалай Андруковіч, Алена Шлегель, Каміль Камал, Леанід Гоманаў, Аляксандр Кошалеў, Леанід Данелія — яны перадалі свае работы БДПУ у дар.

— Гэта знамянальная падзея ў жыцці нашага ўніверсітэта. Сімвалічна, што галерэя пачынае сваю работу перад нашым прафесійным святам — Днём настаўніка, і адкрыццё яе адбываецца ў Год культуры, — кажа **рэктар педагагічнага ўніверсітэта Аляксандр ЖУК.** — Наша краіна мае багатую і слаўную гісторыю, прадстаўленую славутымі асобамі. Кожная з іх хвалявалі не толькі ідэі гуманізму, духоўнай чысціні і служэння сваёй радзіме, але і выхаванне, адукацыя беларускага народа. Яны былі сапраўднымі асветнікамі і педагогамі ў розныя перыяды нашай мінуўшчыны і склалі той трывалы падмурак, на якім і ў сённяшні час трымаюцца адукацыя, навука, педагогіка, выхаванне. На прыкладзе іх жыцця фарміруецца светапогляд сучаснай беларускай моладзі.

Галерэя «Асветнікі зямлі беларускай» стала састаўной часткай экспазіцыі музея педагагічнага ўніверсітэта.

**Соф'я КІСЯЛЁВА**

■ Зачапіла

Рэверс з сеціва

## В. КАНЮТА. «ЛЕГЕНДАРНЫ ЗВЯЗДОВЕЦ»

*(«Звязда» ад 24 верасня)*

— Аўтар кажа пра тое, што ёсць і іншыя версіі таго, як загінуў Уладзімір Амельянюк. Адну з іх у свой час давялося пачуць з вуснаў даследчыка Мінскага падполля. Згодна з гэтай інтэрпрэтацыяй, у той дзень, 26 мая 1942 года, рэдактар падпольнай «Звязды» па нейкіх справах ехаў з іншымі падпольшчыкамі на павозцы. Вядома, было гэта не каля Чырвонага касцёла: якімі б адважнымі ні былі падпольшчыкі, наўрад ці яны асмеліліся б паказацца такім чынам у цэнтры Мінска. Але павозка прыцягнула ўвагу фашыстаў і на ўскрайку сталіцы. Яе абстралялі разам з тымі, хто там ехаў.

У тое меркаванне (дзе б ні загінуў Амельянюк — каля касцёла або на ўскрайку горада), што перад смерцю за рэдактарам падпольнай «Звязды» сачылі, шчыра кажучы, не верыцца. Калі б гэта было так, то наўрад ці яго забілі б — падпольшчык быў патрэбен гітлераўцам жывым. Але магло быць і так, што Амельянюк супраціўляўся, таму іншага выйсця, чым пусціць у яго кулю, у забойцаў не было.

І яшчэ. Тыя супрацоўнікі падпольнай «Звязды», якія перажылі вайну, былі ўпэўнены, што таго ж Амельянюка (як і іншых журналістаў-падпольшчыкаў, якія загінулі ў фашысцкіх засценках) выдаў хтосьці са сваіх. Імя здрадніка мы ўжо ніколі не даведаемся. Затое будзем памятаць імёны тых, хто ў небяспечны ваенны час выбраў іншы шлях — самаахвярнасці і подзвігу.

**Аляксей Л.**, *Гродзенская вобласць.*

## Н. НІКАЛАЕВА. «ІНКЛЮЗІЯ, А НЕ ІЛЮЗІЯ»

*(«Звязда» ад 24 верасня)*



— Баюся, што да інклюзіі нам яшчэ расці і расці, найперш, у маральным сэнсе. Прывяду толькі адзін прыклад: калі дачка маёй суседкі пераходзіла з пачатковай у базавую школу, настаўніца прапанавала сям'і выбраць інтэграваны клас. Маўляў, там і колькасць вучняў меншая, і падыход індывідуальны да ўсіх дзяцей у класе, а не толькі да дзяцей з асаблівасцямі развіцця. Вы б толькі бачылі, колькі абурэння было з боку дарослых, якія былі цвёрда ўпэўнены, што іх дзіця не атрымае ў інтэграваным класе тых ведаў, што дазволяць у перспектыве прэтэндаваць на паступленне ў ВНУ. Яны ўспрынялі інтэграваны клас ні больш ні менш як... рэзервацыю для няўдачнікаў, куды спрабуюць «змясціць» і іх дачку. Вось такая была абраза для бацькоўскіх пачуццяў!

А ўсё пачынаецца з таго, што бацькоў здаровых дзяцей просяць напісаць заяву аб тым, што яны згодны, каб іх дзіця вучылася ў інтэграваным класе. Гэта, лічу, абражае і дзяцей з асаблівасцямі развіцця, і іх бацькоў, якія чакаюць міласці ад усіх астатніх.

Людзям з інваліднасцю вакол нашмат цяжэй, чым многім. Але ж яны часцей за ўсё больш добрыя і лепшыя па сваіх чалавечых якасцях, чым тыя, у каго няма праблем з фізічным і псіхічным здароўем.

**Таццяна Анатолеўна**, *г. Мінск.*

## І. СІДАРОК. «У КАЎБАСЕ І ХЛЕБЕ СТАНЕ МЕНШ СОЛІ, А Ў ЁГУРТАХ — ЦУКРУ»

*(«Звязда» ад 24 верасня)*

— Добрыя пачынанні ў дачыненні да здароўя. Толькі вось не вельмі верыцца, што да 2020 года справяцца. Я за тое, каб курыць забараніць паўсюдна, акрамя ўласнай кватэры, і тое ўнутры і пры зачыненых фортках — хай сабе «дыхаюць» тытунёвым дымам. А вітрыны з усялякімі прысмакамі, што каля касаў стаяць, прапаную знішчыць, каб малыя і не бачылі. Проста жахліва глядзець, якія істэрыкі часам здараюцца, калі маці «кіндэр» не купляе.

Кажуць, што хлеб з каўбасой «здаравейшымі» стануць?.. А як гэта праверыць? Калі можна будзе набываць такія прадукты? Як даведацца, што яны ўжо па новых рэцэптурах зробленыя? Мяне вось яшчэ клапоціць з'яўленне такіх рэчаў, як спрэд замест масла, напітак ёгуртны замест ёгурту, прадукт смятанны замест смятаны — нейкія суцэльныя падманлівыя звычайнай ежы. Вось у іх карысць якая ёсць, акрамя меншага кошту? Ці за танныя грошы набываем большыя праблемы са здароўем?

**Вера Сямёнаўна**, *г. Ліда.*

## Т. ЛАЗОЎСКАЯ. «СЦЯНА СМУТКУ НА ВЯСКОВЫХ МОГІЛКАХ»

*(«Звязда» ад 28 верасня)*

— У нашай вёсцы могілкі знаходзяцца ў бярозавым гаі. Магілы засыпае лісцем. Яго пастаянна даводзіцца прыбіраць. Але гэта не самае складанае. Цягам часу дрэвы струхнелі, ствараюць пагрозу як для людзей, так і для агароджаў, помнікаў. Для таго каб іх спілаваць, патрэбны значныя сродкі. Сельсавет, на балансе якога знаходзяцца могілкі, такіх сродкаў не мае. Староста вёскі Галіна абышла ўсе падворкі, каб сабраць неабходную суму для выдалення бяроз. Але многія землякі абурыліся: маўляў, гэта справа калгаса, сельсавета. Крыўдна і балюча. Тут жа ляжаць іх родныя і блізкія. Дык чаму аб парадку на могілках павінны клапаціцца ўлады? У выніку бярозы зрэзалі каля тых магіл, сваякі якіх не пашкадавалі грошай. А адмова вярнулася жыхарам вёскі, так бы мовіць, бумерангам. Падчас апошняга ўрагану дрэвы пападалі на магілы, пашкодзілі помнікі... Напрыклад, я ў пастанову Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі аб пахавальнай справе ўнёс бы пункт: жыхары павінны ўздельнічаць у добраўпарадкаванні могілак на долевых паях.



А яшчэ мне спадабалася прапанова старшыні Ждановіцкага сельвыканкама Алы Дубко наконт уладкавання газонных пахаванняў. Сапраўды, на нашых вясковых могілках, асабліва ў глыбінцы, ні прайсці, ні праехаць: груваcткія помнікі, агароджы. Мы жывём у іншы час, чым нашы продкі, амаль у цэнтры Еўропы. Дык давайце пераймаць іх вопыт. Усё павінна быць уладкавана сціпла, але прыгожа, з годнасцю.

**Аляксандр Уласенка**, *Брэсцкая вобласць*

■ Грамадою!

# ДЗЕНЬ БЫЎ СВЕТЛЫМ

**У вёсцы Бабровічы Івацэвіцкага раёна адбылося ўрачыстае асвячэнне храма-капліцы ў гонар Святой велікамучаніцы Параскевы Пятніцы і ў вечную памяць 1280 нявінна замучаных і забітых у верасні 1942 года бабравічан, жыхароў вёсак Тупічыцы, Вяда і Красніца.**



Падчас набажэнства ў храме-капліцы.

Чытаеш іх прозвішчы, і стыне душа: "Праскоўя Валуевіч, Агата Валуевіч... Цімафей Пашкевіч, Ганна Пашкевіч з дзецьмі, Дамініка Пашкевіч з дзецьмі..." З чатырма... З сямю... З немаўляткам... Якую ж пакутніцкую смерць яны прынялі! І таму ў дзень асвячэння храма, здаецца, анёламі зацеліся ў Бабровічы, да новай святыні.

БУДАЎНІЦТВА іх — справа народа Божага, як казаў настаяцель яглевіцкага храма айцец Віталій. І калі ты часцінка яго, то ўбаку ніколі не застанешся.

І сапраўды: будоўлю, распачатую краязнаўцам і пісьменнікам Веньямінам Бычкоўскім, прадоўжылі прыхаджане івацэвіцкага храма іконы Божай Маці, а потым і яглевіцкага... Нехта шчыраваў непасрэдна на аб'екце, нехта дапамагаў арганізацыйна, грашыма, малітвай — усё «сцякалася» да айца Віталія, які цалкам аддаваў сябе гэтай справе. Іншы раз ён, здавалася, нават расмаўляць не мог ад стомы, але ж якраз гэта праца на мяжы немагчымага і дазволіла ў кароткі тэрмін завяршыць будаўніцтва храма-капліцы. І асвячэння яго атрымалася вельмі ўрачыстым!

— Ці ж думала я, што дажыву?! Гляджу і сваім вачам не веру, што ў нас, у Бабровічах, ды такое вялікае свята, што столькі бацюшкаў прыехала, што асвячаюць царкву, — праз слёзы казала 88-гадовая Вера Іванаўна Крот. — Там жа напісаны ўсе нашы людзі — і спаленыя, і забітыя... Яны ж гэта бачаць...

З Верай Іванаўнай мы размаўляем каля храма на лаўчацы — ногі ёй ужо не надта служаць. Жанчына расказвае, што сюды, на асвячэнне, на сваёй машыне яе прывёз айцец Віталій і абяцаў завезці назад. Дзякавала Богу, Царыцы Нябеснай і ўсім людзям, што зрабілі гэткую вялікую справу.

— У той дзень я пасвіла карову, — плакала, успамінаючы жанчына. — Ганю іх дамоў, а вёска гарыць, кругом крык, енк, страляніна... Куды мне бегчы, дзе мая мама, дзе ўсе? Гляджу, людзі бягуць да возера, і я за імі... Бяжым, а за спінамі стрэлы. Я ад страху ні ўправа, ні ўлева збочыць не магу... Цэлую ноч у Бабровіцкім возеры прасядзела. З таго часу рукі ў мяне пакурчаны... Холадна вельмі было.

І на раніцу, можна сказаць, не цяплей, бо ёй, чатырнаццацігадовай, страшэнная карціна адкрылася: усюды горкі пах дыму, спаленыя хаты, забітыя людзі.

Жыла ў Выганашчах у сваякоў, потым у лесе сустрэла аднавяскоўцаў. Хапіла ўсяго — голаду, страху. Сястру пагналі ў Германію, там яна і памерла. Вера Іванаўна засталася адна.

УСІХ ахвотных пабыць на першай літургіі невялічкі храм не ўмясціў. Але ж тыя, хто працінуўся, расказвалі, як там хораша: сцены драўляныя, паміж бярвёнамі — вяровачкі прыгожай паклі, разны іканастас і акенцы, праз якія ўнутр зазіраюць сосны...

А дадайце яшчэ да гэтага ўрачысты перабор званоў, анёльскі спеў яглевіцкага царкоўнага хору ды адкрытасць душ падчас урачыстага памінання ўсіх нявінна забітых і спаленых пакутнікаў...

Уладыка Стафан, архіепіскап Пінскі і Лунінецкі, у сваёй пропаведзі казаў, што промыслам Божым было ўстроена ўзвядзенне гэтага храма-капліцы, і дзякаваў айцу Віталію, кіраўніцтву раёна, дабрачыннікам, усім братам і сёстрам за ўзвядзенне яшчэ адной святыні.

Наступным урачыстым момантам было ўручэнне медалёў, грамат Экзархата і падзячных лістоў Анатолію Ткачуку, Аляксандру Молашу, Юрыю Барсукову, Веньяміну Бычкоўскаму, Людміле Пракурат, Веры Власавец, Сяргею Арцёмчыку, Валерыю Калесніковічу, Юрыю Мілеўскаму, Таццяне Молаш, Сяргею Лемяшэўскаму.

...А пасля трапезы, якую ладзілі сіламі прыхаджан, быў час пасядзець, паспяваць духоўныя песні, пагаманіць з людзьмі. Марыя Іванаўна Петруковіч 30 гадоў замужам у Яглевічах, прыехаць на свята ў родную вёску ім з мужам дапамаглі дзеці. «Ажылі мае Бабровічы, — казала жанчына. — Сяджу вось і плачу — такая радасць!.. Мы на Вялікдзень сюды на могілкі прыязджалі, а сёння тут як быццам другі Вялікдзень!»

Пад вялікім уражаннем ад падзеі былі і ганаровыя госці свята, усе наведнікі, бо нехта сустрэў тут сваякоў, нехта — сяброў, нехта проста вярнуўся на родную зямлю.

**Валянціна БОБРЫК**,
*г. Івацэвічы*

■ Што бачу...

# МУЖЧЫНСКАЯ РАЗМОВА

З першым мужам жыццё ў Надзеі не склалася. Выпрабоўваць лёс яшчэ раз, з некім іншым, яна не захацела: бліжэй да сваіх трыццаці нарадзіла дзіця, гадуе яго сама.

Цуд, які харошы ў яе сыночак! Надзя любіць яго без памяці, кожную вольную хвілінку сваю аддае! Напэўна, таму чатырохгадовы Мікітка — маміна сонейка, Божы дарунак — расце кемлівым, добрым, разумным...

Адно ў іх кепска — дзіцячы садок далёка: з гарадской ускраіны, з так званага спальнага раёна, трэба ездзіць ажно ў цэнтр. Але ж гэта яшчэ палова бяды. Другая ў тым, што ў грамадскі транспарт не ўбіцца ні ранкам, ні вечарам!

...Дзён колькі таму яны свята сабе зрабілі — дамоў паехалі на маршрутцы.

Далёка ў салон не пайшлі: Надзя прыткнулася на краёчку сядзення, што каля самага ўвахода, сына ўзяла на калені.

Хутка едуць, камфортна, хоць не бясплатна: маршрутка ім трапілася досыць старая, дзверы без аўтаматыкі — самі не зачыняюцца. І пасажыры забываюцца гэта рабіць. Таму Надзя ледзь не на кожным прыпынку прыўстае, цягнецца да ручкі...

Кіроўца, убачыўшы гэта, на ўвесь салон аб'яўляе:

— Паважаныя пасажыры, калі ласка, выходзячы, зачыняйце дзверы.

І Мікітка ад іх не ўбаку: хочучы дапамагчы — і маме сваёй, і кіроўцу — ён таксама перад прыпынкам напамінае:

— Цёця, зачыніце, калі ласка, дзверы.

Тая, што называецца, нуль увагі: паглядзела, як рублём адарыла, выйшла з салона і нават не азірнулася.

— Дрэнная цёця.

А да дзвярэй між тым прабіраюцца яшчэ дзве. Ім таксама хлопчык нагадвае пра дзверы.

Рэакцыі, на жаль, аніякай: яны, што называецца, вухам не вядуць...

— Мама, ну чаму?

Нарэшце, на выхад кіруе мужчына, і дзіця не вытрымлівае:

— Дзядзька, трасца вам у бок (пераклад з мацернай мой. — **Аўт.**) — зачыніце за сабой дзверы!

Твар Надзеі палае ад сораму, яна гатова праваліцца пад асфальт! Але ж той пасажыр, ашалела лыпнуўшы вачыма, дзверы за сабой... зачыняе.

Значыць, дайшло?

Ці не таму, што сказана было «па-даросламу», на зразумелай мове, як мужык мужыку.

**Наталля Каліноўская**,
*г. Віцебск*

белагропромбанк
традиции будущего

**Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» сообщает, *что в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк», на основании предложения Правления ОАО «Белагропромбанк»* 07 октября 2016 года проводится внеочередное Общее собрание акционеров в заочной форме.**

Место нахождения общества, место и время проведения собрания: 220036, г. Минск, проспект Жукова, 3, 15.00.

Повестка дня

1. Об утверждении изменений в Кодекс корпоративного управления ОАО «Белагропромбанк».
2. Об утверждении Положения о Наблюдательном совете ОАО «Белагропромбанк».

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 30 сентября 2016 года.

С материалами по вопросам повестки дня лица, имеющие право на участие в Общем собрании акционеров, могут знакомиться по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк» (г. Минск, проспект Жукова, 3) с 01 октября по 05 октября 2016 г. ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 8.30 до 12.30.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы по месту нахождения акционеров, а также иметь при себе документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – дополнительно документ, подтверждающий полномочия).

Заполненные бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 05 октября 2016 года по адресу: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, депозитарий ценных бумаг ОАО «Белагропромбанк» почтовой связью, нарочным по месту нахождения Правления банка и филиалов по месту нахождения лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, средствами факсимильной связи по телефону/факсу: 229 64 10 или 229 64 51 с обязательной последующей доставкой (досылкой) оригинала бюллетеня.

Принявшими участие в Общем собрании акционеров считаются лица, заполненные бюллетени которых получены ОАО «Белагропромбанк» в установленном порядке.

Телефон для справок: 8(017) 229 64 10.

**ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136**
время работы Контакт-Центра Банка
8.00 - 20.00 - рабочие дни
8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) - по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

**www.belapb.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот №1. Капитальное строение с инв. № 250/С-13208 (корпус заводоуправления) общей площадью 2807.00 кв.м, начальная стоимость лота – 417 000 белорусских рублей** |
| **Собственник (владелец) имущества** | Открытое акционерное общество «Технолит Полоцк» |
| **Местонахождение имущества** | г. Полоцк, ул. Ленинградская, 101. По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к хранителю имущества – Юркевич Виталий Геннадьевич (т.м. 80297117680) |
| **Наличие обременений** | Не имеется |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4 27 октября 2016 года в 10.00 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 Судебный исполнитель Атрахимович Николай Александрович, тел. (0212) 61 40 24 Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 15.00 26 октября 2016 года.**<br>Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

## РУП «Белпочта» ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРЕГОВОРОВ ПО ВЫБОРУ ПОДРЯДНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ

**для выполнения ремонтно-строительных работ на объекте «Текущий ремонт зенитных фонарей в здании авторемонтной мастерской по ул. Лукьяновича, 6/2 в г. Минске».**

**Процедура переговоров состоится 03 октября 2016 года в 09.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10.**

Контакты для получения дополнительной информации: отдел капитального строительства РУП «Белпочта» – тел. 293-55-29.

УНП 101015738

Центр Промышленной Оценки
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Трест №26 Железобетонмонтаж», г. Минск, ул. Харьковская, 15. Тел.: +375 17 256 90 05** |

**Предмет аукциона, назначенного на 02.11.2016 г.**

| № п/п лота | Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Здание холодного склада (литер Б 1/м)** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 303 кв.м | 500/С-31540 |
| | **Здание столярной мастерской (литер В 1/м)** | Здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель | 68 кв.м | 500/С-32065 |
| | Составные части и принадлежности: забор ж/б, площадка из плит дорожного покрытия | | | |
| Начальная цена с НДС 20% – **153 880 руб. 85 коп.** (1 538 808 500 бел. руб.) Шаг аукциона: **7 694 руб. 04 коп.** (76 940 425 бел. руб.) | | | | |
| 2 | **Здание склада с гаражом (литер А 2/кп)** | Здание многофункциональное | 476 кв.м | 500/С-31450 |
| | Составные части и принадлежности: площадка из плит дорожного покрытия | | | |
| Начальная цена с НДС 20% – **235 956 руб.** (2 359 560 000 бел. руб.) Шаг аукциона **11 797 руб. 80 коп.** (117 978 000 бел. руб.) | | | | |
| 3 | **Здание рампы с навесом (литер Г 1/м)** | Здание неустановленного назначения | 149 кв.м | 500/С-31451 |
| | Составные части и принадлежности: забор ж/б с металлическими воротами, площадка из плит дорожного покрытия | | | |
| Начальная цена с НДС 20% – **44 475 руб. 23 коп.** (444 752 300 бел. руб.) Шаг аукциона: **2 223 руб. 76 коп.** (22 237 615 бел. руб.) | | | | |
| **Месторасположение лотов №№1–3:** г. Минск, ул. Промышленная, д. 9А. **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,2892 (га) предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений производственной базы и является неделимым. Ограничения прав: обеспечение доступа для производства ремонтно-восстановительных работ, пл. 0,2892 га | | | | |
| 4 | **Помещение склада со спецодеждой** | Складское помещение | 443,1 кв.м | 500/D-7021980 |
| **Месторасположение:** г. Минск, ул. Промышленная, д. 11, пом. 1 | | | | |
| Начальная цена с НДС 20% – **224 278 руб. 880 коп.** (2 242 788 000 бел. руб.) Шаг аукциона: **11 213 руб. 94 коп.** (112 139 400 бел. руб.) | | | | |

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Клименок Светлана Владимировна, председатель ликвидационной комиссии, контактный телефон +375296281025 |
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **02.11.2016 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **01.11.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |

**Предмет аукциона, назначенного на 03.11.2016**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Встроенное помещение** | Помещение неустановленного назначения | 190 кв.м | 700/D-95849 |
| **Месторасположение:** г. Могилев, пр-т Пушкинский, 63 | | | | |
| Начальная цена с НДС 20% – **95 413 руб. 56 коп.** (954 135 600 бел. руб.) Шаг аукциона: **4 770 руб. 68 коп.** (47 706 800 бел. руб.) | | | | |

***Транспорт и спецтехника расположены по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, д. 78а** в составе:*

| № п/п лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 2 | 424 | **Автомобиль ГАЗ 5312 (рег. знак ТМ 9810, г.в. 1990)** | 1 509 руб. 28 коп. (15 092 800) | 75 руб. 46 коп. (754 600) |
| 3 | 553 | **Автомобиль SKODA FABIA (рег. знак 7044 АН-6, г.в. 2006)** | 4 952 руб. 30 коп. (49 523 000) | 247 руб. 62 коп. (2 476 200) |
| 4 | 570 | **Автокран МАЗ 533702 45729А (рег. знак ТС 0300, г.в. 2007)** | 28 063 руб. 06 коп. (280 630 600) | 1 403 руб. 15 коп. (14 031 500) |
| 5 | 590 | **Автомобиль МАЗ 543205-226 (рег. знак ТС 0153, г.в. 2007)** | 9 432 руб. 96 коп. (94 329 600) | 471 руб. 65 коп. (4 716 500) |
| 6 | 627 | **Полуприцеп МАЗ 938660 (рег. знак 1641 АА-6, г.в. 2010)** | 4 480 руб. 66 коп. (44 806 600) | 224 руб. 03 коп. (2 240 300) |
| 7 | 565 | **Автомобиль ГАЗ 330232 (рег. знак 1484 АА-6)** | 1 308 руб. 00 коп. (13 080 000) | 65 руб. 40 коп. (654 000) |
| 8 | 632 | **Автогидроподъемник МАЗ 457043 PMS-22 (рег. знак АВ 3241-6, г.в. 2009)** | 35 609 руб. 42 коп. (356 094 200) | 1 780 руб. 47 коп. (17 804 700) |
| 9 | 378 | **Трактор МТЗ-80Л (рег. знак 0815 МЖ, г.в. 1986)** | 3 301 руб. 54 коп. (33 015 400) | 165 руб. 08 коп. (1 650 800) |
| 10 | 4098 | **Блок контейнер БК-1, 2014 г.** | 3 065 руб. 71 коп. (30 657 100) | 153 руб. 28 коп. (1 532 800) |
| 11 | 4097 | **Блок контейнер БК-1, 2014 г.** | 3 065 руб. 71 коп. (30 657 100) | 153 руб. 28 коп. (1 532 800) |
| 12 | 4094 | **Контейнер офисно-бытовой, 2013 г.в.** | 5 188 руб. 13 коп. (51 881 300) | 259 руб. 41 коп. (2 594 100) |
| 13 | 596 | **Подмости б/у** | 4 952 руб. 30 коп. (49 523 000) | 247 руб. 62 коп. (2 476 200) |
| 14 | 633 | **Подмости передвижные электрические ППЭ-12.01.А** | 7 310 руб. 54 коп. (73 105 400) | 365 руб. 53 коп. (3 655 300) |

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Жаглевский Д.Д., зам. председателя по ликвидационной комиссии, контактный телефон: +375336543531 |
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **03.11.2016 в 12.00 по адресу: г. Могилев, пр-т Пушкинский, д. 63, филиал СУ-86 ОАО «Трест №26 Железобетонмонтаж»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **01.11.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by**

